Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

...ньня—XV
...0 (3984)
...ніцкі, 23 САКАВІКА 1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Ленинград. Университет. Библ. 7-й, фундамент. библ. чит. фонд. отд. | зал. — 1

У тэрмін выканаць баявы загад партыі і ўраду

З дня апублікаваньня гістарычнай АДОЗВЫ СНК І ЦК АБ КАНТРАКТАЦЫІ прайшло два месяцы. Тэрмін зусім выстарчальны для таго, каб «узяцца пабальшавіцку» эа справу кантрактацыі яравых пасеваў, мабілізаваць свае сілы і растлумачыць масам рабочых і сялян значэньне мер, якія праводзяцца савецкай уладай па тэхнічным пераўзбраеньні і калектывізацыі сялянскіх гаспадаран, стаць на чале новага ўздыму калгаснага руху мільённых мас вёскі і забясьпечыць гэтым самым рашаючыя посьпехі ў справе ліквідацыі кулацтва і сацыялістычнай перабудовы вёскі».

Да выкананьня гэтых гіганцкіх задач, да ажыцьцяўленьня гэтай разгорнутай праграмы пераможнага будаўніцтва сацыялізму, СНК і ЦК заклікалі ўсе партыйныя, савецка-гаспадарчыя, кооперацыйна-калгасныя і камсамольскія арганізацыі.

Барацьба за выкананьне задач, пастаўленых у адозьве СНК і ЦК — гэта барацьба за пяцігодку, за пераможнае завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР у бягучым 1931 годзе. Барацьба за кантрактацыю—гэта барацьба за хлеб, за сыр-даву базу індустрыялізацыі, за новы магутны ўздым калгаснага руху і ліквідацыю кулацтва як класы на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Ня гледзячы на ўсё гэта нявымерка вялізарнае значэньне кантрактацыі, яе практычнае правядзеньне разгорнута ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА. Ход кантрактацыі яравых выклікае самую СУР'ЕЗНУЮ ТРЫВОГУ. Ён сыгналізуе аб тым, што шмат цэнтральных і нізавых арганізацый яшчэ і на сёнешні дзень не разгарнулі сапраўды бальшавіцкай барацьбы за ажыцьцяўленьне адозвы СНК СССР і БССР і ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б аб кантрактацыі яравых пасеваў. Ён сыгналізуе аб тым, што рад арганізацый пралуўляе махровы апартунізм на практыцы, нічога ня робячы, каб забясьпечыць выкананьне праграмы кантрактацыі.

1-га КРАСАВІКА АБАВЯЗКОВА-ПАВІННА БЫЦЬ СКОНЧАНА ЗАКЛЮЧЭНЬНЕ КАНТРАКТАЦЫЙНЫХ ДАГАВАРОЎ. Няма гарантыі, што пры СУЧАСНЫХ тэмпах работы, пры СЁНЕШНІМ становішчы спраў гэта задача будзе своечасова выканана. На самай справе, паводле даных на 15-га сакавіка плян кантрактацыі яравых выкананы у надзвычайна малым разьмеры. Па лініі асноўных кантрактуючых арганізацый, АСАБЛІВА БЕЛІЛЬНАСАЮЗУ, вызначаныя пляны АМАЛЬ ЗУСІМ НЯ ВЫКОНВАЮЦЦА. НА БССР, ЯК НА АДЗІН З АСНОЎНЫХ ІЛЬНАВОДЧЫХ РАЁНАЎ САВЕЦКАГА САЮЗУ, УСКЛАДЗЕНЫ АСОБНЫЯ ЗАДАЧЫ ПА КАНТРАКТАЦЫІ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР, У ПРЫВАТНАСЬЦІ ІЛЬНУ. Між тым, кантрактацыя ільну і да гэтага часу фактычна зусім не разгорнута. На 15 сакавіка плян кантрактацыі ільну выкананы усяго толькі на 5,47 проц. Значэньне, ганебнейшае адставаньне. Адставаньне, якое сьведчыць аб тым, што ў цэлым радзе ільнаводных раёнаў не вядзецца ніякай барацьбы за кантрактацыю ільну, што ў іх, гэтых раёнах, панае праваапартуністычная стаўка на самацёк.

У матар'ялах, якія публікуюцца сёньня ў «Зьвязьдзе», можна знайсьці нямала такіх фактаў праваапартуністычнай практыкі. У КАПЫЛЬСКІМ раёне, напрыклад, і да гэтага дня ніякая растлумачальная і арганізацыйная работа вакол адозвы СНК і ЦК аб кантрактацыі не разгорнута. АДОЗВА ЗУСІМ НЕ ПАПУЛЯРЫЗАВАНА СЯРОД КАЛГАСНЫХ І АДНААСОБНЫХ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ МАС. Пляны кантрактацыі да калгасаў і паасобных гаспадарак не разьведзены. У выніку такой правай практыкі ў раёне яшчэ зусім не заключаны кантрактацыйныя дагаворы. НІ АДЗІН ГЭКТАР ПАСЕВАЎ НЕ ЗАКАНТРАКТАВАН. Такое-ж становішча характэрна і для ЗАСЛАЎСКАГА раёну, дзе кантрактацыя яравых злачынна зрываецца. У СЛУЦКУ раённыя арганізацыі падмянілі практычную работу па правядзеньні кантрактацыі праваапартуністычнай стаўкай на самацёк. Ні адна раённая арганізацыя на справе нічога не зрабіла, каб рэалізаваць адозву партыі і ўраду аб кантрактацыі яравых пасеваў. На сёнешні дзень у гэтым раёне аформлены толькі... 2 дагаворы па кантрактацыі. З ДРЫБІНСКАГА рэёну нам паведамляюць, што кантрактацыя яравых стаіць пад пагрозай поўнага провалу. Аднак, раённыя арганізацыі, пачынаючы ад райкому партыі і канчаючы сельсаветамі, нічога канкрэтнага ня ўжываюць, каб ліквідаваць гэты ганебны злачынны прарыў.

Заслаўскі, Спуцкі, Капыльскі і іншы райкомы партыі, якія дапускаюць фактычны зрыў кантрактацыі яравых пасеваў, пранўляюць самы махровы правы апартунізм на практыцы. Партыйна-савецкае кіраўніцтва гэтых раёнаў, як і другіх раёнаў, дзе кантрактацыя стаіць пад ударам з-за праваапартуністычнай практыкі, дзе адозва СНК і ЦК не рэалізуецца, павінна пакласьці самую суровую адказнасьць.

Трэба рашуча ўзмацніць самую суровую барацьбу з усякай правай праваапартуністычнага самацёку пры правядзеньні кантрактацыі. Трэба без усякай пітасьці ўдарыць па правай практыцы тых арганізацый, якія злачынна зрываюць кантрактацыю яравых пасеваў. Правыя апартуністы, дасканала разумеючы, што рэалізацыя адозвы СНК і ЦК наносіць новы сьмяротны ўдар па іх здрадніцкай кулацкай праграме, працуюць сарваць выкананьне бальшавіцкіх плянаў кантрактацыі яравых пасеваў. Сарваць для таго, каб абараніць інтарэсы кулацтва, каб затармазіць сацыялістычнае наступленьне, каб затрымаць новы магутны ўздым суцэльнай калектывізацыі, дапамагаючы гэтым самым сакрыя-фашызму, граючы на-руку гэтым самым інтэрвэнтам і іх агентуры — шкоднікам. Таму толькі, бязьлітасна руйнуючы сабатаж правых апартуністаў, непрымірыма змагаючыся з праваапартуністычнымі самацёчнымі настроямі і практыкай, можна забясьпечыць круты і карэнны пералом у рэалізацыі праграмы кантрактацыі яравых.

КАЛГАСНА-КООПЭРАЦЫЙНАЯ СЫСТЭМА, як сьведчаць шматлікія факты з месц, зусім нездавальняюча. АГІДНА ДРЭННА рэалізуе адозву СНК і ЦК аб кантрактацыі. Пераважная большасьць райза, райкалгассаюзаў і, у першую чаргу РАЙКООПСАЮЗЫ І РАЙГАНДЛІ, аддаюць кантрактацыі зусім нездавальняючую, невыстарчальную, злачынна слабую ўвагу. Аб гэтым ярка сьведчыць той факт, што па лініі кааперацыйнай сыстэмы плян кантрактацыі выкананы усяго на некалькі процантаў (менш 4-х). Вялікая віна за такое агіднае становішча кладзецца і на тых ЦЭНТРАЛЬНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ЯКІЯ НЕПАСРЭДНА АДКАЗВАЮЦЬ ЗА КАНТРАКТАЦЫЮ. БЕЛІЛЬНАСАЮЗ, БЕЛСАДСАЮЗ, БЕЛМАЛЖЫВСАЮЗ і г. д., якія з такім недапушчальным спазьненьнем спусьцілі тыповыя дагаворы на месцы, да гэтага часу НЯ ПРЫНЯЛІ ЭНЭРГІЧНЫХ І РАШУЧЫХ МЕР, КАБ ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫВЫ Ў ХОДЗЕ КАНТРАКТАЦЫІ.

Далей так быць ня можа. БАЯВЫ ЗАГАД ПАРТЫІ І УРАДУ АБ КАНТРАКТАЦЫІ ЯРАВЫХ ПАСЕВАЎ МОЖА І ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫКАНАН НА ЧЫМ-БЫ ТАМ НІ СТАЛА АБАВЯЗКОВА Ў ТЭРМІН. Трэба ў самыя бліжэйшыя дні дабіцца карэннага пералому ў выкананьні праграмы кантрактацыі. На гэту справу павінны быць кінуты сілы цэнтральных і нізавых арганізацый, усе сілы грамадзкасьці.

КАНКРЭТНЫХ ВІНАВАТЫХ, якія зрываюць кантрактацыю, якія сабатуюць адозву партыі і ўраду — ПАД СУД. Ніякай літасьці правым апартуністам, якія кулаку на выгаду тармозяць кантрактацыю яравых пасеваў. Мацней удар па праваапартуністычнай практыцы, па стаўцы на самацёк. Усе сілы, усю энэргію — на рэалізацыю адозвы СНК і ЦК. Трэба шчыльна і арганічна злучыць усе гаспадарча-палітычныя кампаніі з барацьбой за кантрактацыю яравых. Падрыхтоўку да другой калгаснай вясны, барацьбу за новы прыплў трэба зьвязаць у адно цэлае з рэалізацыяй адозвы СНК і ЦК аб кантрактацыі. Гэтага патрабуе партыя. Гэтага патрабуе справа далейшага пераможнага будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне.

У бои за вырашэньне мясной праблемы

Ў ТРЭЦІМ РАШАЮЧЫМ ГОДЗЕ ПЯЦІГОДКІ

клічуць ударнікі—будаўнікі сацыялістычных фабрык мяса БССР

12 таварных сьвіней, замест 10
Узьняць прадукцыйнасьць працы на 40 проц.
Поўнасьцю ліквідаваць прарывы і прастоі

Усю работу на зьдзельна-прэміяльную сыстэму
Аўладаць тэхнікай
Ушчыльніць рабочы дзень

Такі сустрэчны плян Усебеларускага зьлёту ўдарнікаў рабочых сьвінаводчых саўгасаў

ДА УСІХ УДАРНІКАЎ, РАБОЧЫХ, РАБОТНІЦ і СПЭЦЫЯЛІСТАЎ САЎГАСАЎ БССР

(З адозвы Ўсебеларускага зьлёту ўдарнікаў рабочых сьвінагадоўчых саўгасаў)

VI-ты Усесаюзны зьезд саветаў вызначыў далейшыя бальшавіцкія тэмпы саўгаснага і калгаснага будаўніцтва і вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы. Мы, ударнікі саўгасаў, добра разумеем, што гэтыя тэмпы зьвязаны з труднасьцямі на даным этапе. Але гэтыя труднасьці—наша гордасьць. Гэта труднасьці росту сацыялізму. Мы гэтыя труднасьці павінны перамагчы і пераможам выпрабаваным мэтадам—шляхам далейшага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Таму, мы, ударнікі сьвінаводчых саўгасаў, абавязваем сябе мабілізаванымі на барацьбу з труднасьцямі і самазамацоўваемся па сваіх саўгасах да канца пяцігодкі. Гэта зьявіцца нашым лепшым пралетарскім адказам інтэрвэнтам, шкоднікам і ўсім буржуазным прыхвасьням, якія лічаць, што ў СССР уведзена прымусовая праца.

Мы ўдарнікі бярэм на сябе наступныя абавязацельствы:

Поўнасьцю выканаць дырэктывы ЦК КП(б)Б і ў 1931 годзе ўкамплектаваць саўгасы «Сьвінаводу» ня менш, як 75.000 сьвінаматкамі.

Даць дзяржаве ня менш 60.000 таварных сьвіней і ў парадку сустрэчнага дабіцца выхаду ня менш 12 таварных сьвіней, замест 10 вызначаных прамфінплянам ад адной сініматкі ў год.

Узьняць ня менш, як на 40 проц. прадукцыйнасьць працы.

Максымальна ўшчыльніць рабочы дзень, поўнасьцю зьнішчыць прагулы і прастоі.

Перавесьці ўсе работы на зьдзельна-прэміяльную сыстэму аплаты працы.

Аўладаць тэхнікай, агратэхнікай і зоавэтэхнікай.

Мы заклікаем ударнікаў, рабочых, работніц і спэцыялістаў саўгасаў «Сьвінавод» актыўна мабілізавацца на выкананьне гэтых вялізарных задач! Усе вашы сілы, усю вашу энэргію, ініцыятыву і бальшавіцкую настойлівасьць—на поўнае выкананьне і перавыкананьне прамфінплянаў мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва!

Усебеларускі зьлёт ударнікаў зьвяртаецца з заклікам да рабочых, работніц і спэцыялістаў усіх саўгасаў Савецкай Беларусі ПАМНАЖАЦЬ РАДЫ УДАРНІКАЎ, ВЫШЭЙ УЗЬНЯЦЬ СЬЦЯГ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА. УСТУПАЙЦЕ ВА ЎДАРНЫЯ БРЫГАДЫ! НАШ ЛЁЗУНГ ЗЬЛЁТУ ЎДАРНІКАЎ—«НЯМА САЎГАСНЫХ РАБОЧЫХ ПА-ЗА РАДАМІ ЎДАРНІКАЎ! НЯМА САЎГАСАЎ БЯЗ ЎДАРНЫХ, «СКВОЗНЫХ» БРЫГАД І СУСТРЭЧНЫХ ПРАМФІНПЛЯНАЎ! НЯМА ЎДАРНЫХ БРЫГАД БЕЗ КАНКРЭТНЫХ САЦДАГАВАРОЎ! УДАРНІКІ І ЎДАРНАЯ БРЫГАДА, НЯ ВЫКАНАЎШЫЯ ЎЗЯТЫХ НА СЯБЕ САЦАБАВЯЗКАЎ, НЯ МОГУЦЬ НАСІЦЬ ВЫСОКАЙ ГОДНАСЬЦІ—УДАРНІКАЎ! НІ АДНАГО «ІЛЖЭУДАРНІКА» Ў САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РАДОХ УДАРНІКАЎ!»

Таварышы ўдарнікі—рабочыя фабрык і заводаў!

Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ў вас распачалося значна раней і зьяўляецца ўжо сталым мэтадам новых камуністычных форм працы. Вы маеце ўжо багацейшы вопыт. Мы, ударнікі фабрык мяса, малака і збожжа, зьвяртаемся да вас з заклікам—дапамажэце і нам лепш арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва. Бярэце шэфства над саўгасамі, перанясеце ўзоры і вопыты сваёй працы ў саўгасы для таго, каб ян мог хутчэй мы разам з вамі вырашылі мясную праблему і далі ўсе неабходныя прадукты харчаваньня для гарадзкіх рабочых.

Таварышы працаўнікі навукова-дасьледчых інстытутаў і пралетарскія пісьменьнікі! Не забывайце, што шкодніцтва, якое было раней у сельскай гаспадарцы і на фронце літаратуры, значна адбілася на саўгасах. Мы патрабуем ад вас больш актыўнай НАВУКОВАЙ РАБОТЫ ВА ЎСІХ ПРАЦЭСАХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ. МЫ ТАКСАМА чакаем ад вас у бліжэйшы час папулярных, нашых пралетарскіх кніжак па арганізацыі працы ў саўгасах, па агранамі, зоавэтэхніцы і г. д.

Таварышы, чырвонасьцяжнае настаўніцтва!

Мы цэнячаем вялікія заслугі на культурным фронце і ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці, у тым ліку і сярод сельгаспрабочых і батрацтва, але просім вас не забываць, што няпісьменных сельска-гаспадарчых рабочых і батрацтва яшчэ 35—40 проц. не ахоплена пікунктамі. Дапамажэце сельгаспрабочым і батрацтву падрыхтавацца ў ВНУ, ВНТУ, рабфакі і тэхнікумы.

Таварышы ўдарнікі, рабочыя, работніцы і спэцыялісты саўгасаў БССР! Мы не павінны забываць наказ 1-га Усесаюзнага зьезду ударных брыгад, што «ўся краіна павінна стаць ударнай па мэтадах, па тэмпах, па якасьці сваёй работы».

Яшчэ больш згуртоўваючы свае рады вакол камуністычнай партыі, рашуча змагаючыся за правядзеньне адзінай правільнай генэральнай лініі, памнажаючы рады ўдарнікаў, ператвараючы сацыялістычнае спаборніцтва ў сталы мэтад сваёй штодзённай работы, усе, як адзін, у бой за пасьляховае ажыцьцяўленьне пяцігодкі за 4 гады, за вырашэньне мывелагадоўчай праблемы ў 3 цім рашаючым годзе пяцігодкі, за лепшае правядзеньне другой бальшавіцкай сяўбы за выкананьне фінансавых плянаў, за суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю кулацтва, як класы.

Няхай жыве сацспаборніцтва і ўдарніцтва!

Няхай жыве камуністычная партыя—правадыр і арганізатар сацыялістычнага будаўніцтва!

Шыта белымі ніткамі

Паводле паведамленьня польскіх газэт, 9-га красавіка ў Варшаўскім акруговым судзе пачінен адбыцца працэс Палянскага—аднаго з арганізатараў замаху на савецкае паўпрэдства ў Варшаве ў красавіку мінулага году.

Працэс Палянскага будзе трэцім па парадку працэсам антысавецкіх тэрарыстаў, якія выбіраюць замах на жыцьцё савецкіх прадстаўнікоў у Польшчы ў якасьці асноўнага спосаба правакаваньня канфлікту паміж СССР і Польшчай. Тэрор супроць савецкіх прадстаўнікоў у Польшчы пачаў ужывацца іменна ў той момант, калі ў сувязі з прыходам да ўлады кіруючага цэлер лягеру пілсудчыкаў рэжым узмацніўся антысавецкая ўстаноўка зьнешняй палітыкі Польшчы.

Актывізацыя варожых СССР колаў у Польшчы, непарыўная антысавецкая кампанія, якія суправаджаліся агідным цкаваньнем савецкага дыпляматычнага прадстаўніцтва, стварылі тую насычаную антысавецкім настроем палітычную абстаноўку, якая разьвязала рукі Кавэрдзе і Вайцахоўскаму, арганізатарам замаху на паўпрэдства, і тым, хто стаяў за іх сьпіной.

Апублікаваньні ў польскай прэсе даных аб падыходзячым працэсе Палянскага не пакідаюць ніякіх сумненьняў у тым, што гэты працэс пакіне ўдалы ходу нават тую камэдыю «суда», якая мела месца ў сувязі з замахамі Кавэрдзе і Вайцахоўскага. Напомнім, што ў двух апошніх справах усе намаганьні польскай улады былі накіраваны не на тое, каб выкрыць усе ніці замаху, выкрыць супольнікаў, а на тое, каб прадставіць тэрарыстычныя замахі як «індывідуальныя акты помсты», «спрэчак рускіх паміж сабой», эпізодам барацьбы белай эміграцыі з камунізмам.

І Каверда і Вайцахоўскі, фармальна асуджаныя, адышлі маральна апраўданымі польскім судом, у арэоле «мучанікаў».

Апублікаваньне ў польскіх газэтах абвінавачэньня ў справе Палянскага кідае яркае сьвятло на тую правакацыйную гульню, якую польская ўлада арганізуе вакол гэтай справы. Сьледчы матар'ял згрупаваны такім чынам, каб падкрэсьліць, перш за ўсё, як гэта было і раней, «індывідуальны» характар замаху, ня гледзячы на тое, **што само абвінавачэньне заключэньне прыводзіць даныя, якія паказваюць, што Палянскі дзейнічаў пры дапамозе арганізацыі.** Абвінавачэньне заключэньне зьвярнула падазрона многа ўвагі на тых нічых бок замаху. Наперакор першапачатковай экспэртызе, зробленай польскімі ваеннымі спэцыялістамі, навочна вынукляецца «адсталасьць тэхнікі» замаху. Фігуруючыя ў абвінавачэньні заключэньні «стары провад», гадзінны мэханізм ад «надпошанага» будзільніка, мэталёвая бутэлька, куплянная Палянскім на адной з варшаўскіх барахолак, пачінны паказаць услыж сьвету, што замах меў ня «сур'ёзны» характар.

Аднак, «гвоздзем» абвінавачэньня зьяўляюцца біяграфічныя даныя аб віноўніку замаху. Палянскі малюецца, як вораг «бальшавізму», у якім ён бачыў «праяву імкненьня ўгрэнэ да захопу ўлады над хрысьціянскім сьветам».

Як і належыць у такіх выпадках, Палянскі, хоць родам з Букавіны, заяўляе, што «лічыць Расію сваёй бацькаўшчынай», і выказвае свой жаль, што няма такой арганізацыі, якая паставіла б сваёй мэтай «барацьбу з расійскім камунізмам» шляхам замаху на савецкія прадстаўніцтвы ў розных дзяржавах для правакаваньня такіх чынам вайны і зьнішчэньня бальшавізму.

Асабліва «сэнсацыйнымі» зьяўляюцца біяграфічныя даныя аб Палянскім за адзін 1923-24 г.

На працягу трох месяцаў 1923 г. Палянскі, высланы, быццам як «ідэйны камуніст», з Вэнгрыі, Югаславіі і Румыніі, прыбыўшы ў Вену бяз права на жыхарства ў гэтым горадзе, робіць «с ног сшибательную» кар'еру ў вэнскім савецкім паўпрэдстве ад «супрацоўніка гаспадарчага аддзелу да... ваеннага штаба». Апошняе, аднак, не перашкаджае яму жыць, быццам, у лягеры для ваенна-палонных у Вене і эвакуіравацца ў СССР у якасьці былога ваенна-палоннага.

Гэты «выдатны камуніст», накіраваны, быццам, на прыбыцьці ў СССР з якогасьці карнага пункту адразу ў Маскву «у распараджэньне ЦК РКП», амог на працягу некалькіх месяцаў «расчаравацца» ў камунізьме, прабрацца ў Польшчу, судзіцца там, быццам, за шпіянаж і брадзяжніцтва і пасьля на працягу пяці год спакойна жыць у якасьці **польскага грамадзяніна,** хоць да гэтага ён, быццам, ня меў нічога агульнага з Польшчай.

Абвінавачэньне заключэньне, на жаль, не выкрывае нам, чаму ўчарашні «ідэйны камуніст» і «ваенны атаман» быў прыняты ізноў у 1925 годзе у польскае грамадзянства, амог атрымаць нават ільготны пашпарт на выезд заграніцу.

Абвінавачэньне з зусім зра зумелай мэтай абышло гэтыя вельмі і вельмі відавочна, шчакатлівыя для польскай юстыцыі моманты і скансэтравала ўсю сваю ўвагу іменна на вельмі дзіўным «камуністычным» мінулым Палянскага да 1924 г. Гэта дае магчымасьць загадзя прадугледзець характар надыходзячага працэсу.

Падсудны будзе прадстаўлен як «ідэйны камуніст», які быў супрацоўнікам савецкай улады ў мінулым і ўкарыстаўся не падтрыманьнем», «расчараваны» пасьля ў «камунізьме і які зараз помсьціць за нейкія крыўды». Па вольце працэсаў Кавэдры і Вайцахоўскага можна загадзя сьцьвердзіць, што і пракурор і абарона ўжывуць усё сваё красамоўства для таго, каб суд над ніноўным тэрарыстычнага замаху перанесьці ў роўніцу асьвятленьня замаху, як «барацьбы ў лягеры камуністаў», **адцягваючы тым самым увагу ад тэй абстаноўкі ў Польшчы, ва ўмовах якой могуць, пры патураньні польскай улады, рабіцца тэрарыстычныя замахі на савецкіх дыпляматычных прадстаўнікоў.**

Ёсьць усе падставы чакаць, што суд над Палянскім будзе ператворан уплывовымі коламі ў Польшчы ў вялікую антысавецку дэманстрацыю. Намёкі ў польскай урадавай прэсе на нейкія выкрыцьці, якія, нібыта, Палянскі зьбіраецца зрабіць на судзе, пацьвярджаюць меркаваньні аб такой іменна ражысуры гэтага судовага працэсу.

Рабочая кляса і працоўныя масы СССР успрымуць гэту антысавецкую маніфэстацыю, як праўленьне салідарнасьці польскіх уралавых колаў з тымі сіламі, якія ўзмоцнена працуюць над уцягненьнем Польшчы ў новую антысавецкую вайну.

(«ПРАВДА»).

Падрыхтоўка новай антысавецкай правакацыі на Далёкім Усходзе

БЭРЛІН, 22. Орган фашысцкага мла-да-нямецкага ордэна «Юнгдэйчэр» зьмяшчае ў якасьці перадавой артыкул дэпутата рэйхстагу АБЭЛЯ пад загалоўкам «БАРАЦЬБА З СССР НА ДАЛЁКІМ УСХОДЗЕ».

Абэль абмяркоўвае ваенныя прыгатаваньні імпэрыялістычных дзяржаў на Далёнім Усходзе супроць Савецкага Саюзу. Канстатуючы, што кіраўніцтва антысавецкім фронтам перайшло АД АНГЛІІ І ФРАНЦЫІ, Абэль спыняецца НА ПАЕЗДЦЫ Ў МІНУЛЫМ ГОДЗЕ ПРАДСТАЎНІКОЎ ФРАНЦУСКАГА МІНІСТЭРСТВА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ І ФРАНЦУСКАГА ГЕНЭРАЛЬНАГА ШТАБУ Ў НАНКІН. ЗАДАЧАЙ ФРАНЦУСКАЙ МІСІІ БЫЛО ПРАПАНАВАЦЬ НАНКІНСКАМУ ЎРАДУ ПЛЯН АБ'ЯДНАНЬНЯ ЎСІХ АНТЫСАВЕЦКІХ СІЛ ДЛЯ ЎЗБРОЕНАЙ ІНТЭРВЭНЦЫІ Ў СССР. У склад дэлегацыі ўваходзілі афіцэры французскага генэральнага штабу і французскай контр-разьведкі, а таксама рад былых царскіх афіцэраў, якія жылі ў Парыжы. У складзе дэлегацыі была АСОБНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ДЛЯ ВЯРБОЎКІ КІТАЙСКІХ АНТЫСАВЕЦКІХ АГЕНТАЎ І АРГАНІЗАЦЫІ ДЛЯ ПАВЯДЗЕНЬНЯ ДЫВЕРСІЙНАЙ ПРАПАГАНДЫ. Вырашалася выкарыстаць Тыбэт, як месца ваеннай падрыхтоўкі антысавецкай арміі.

Далей Абэль паведамляе, што шляхам подпупу вышэйшых кітайскіх афіцэраў са штабу Чан Кай-шы французам удалося пранікнуць у Тыбэт. ТАМ АРГАНІЗУЮЦЦА ЗАМЕЖНЫЯ ЛЕГІЁНЫ, БЛІЖЭЙШАЙ ЗАДАЧАЙ ЯКІХ, НІБЫ, ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ПОЎНЫ ЗАХОП К.-У. ЧЫГ. Абэль сьцьвярджае, што ФРАНЦУСКАЯ КАМІСІЯ ПРАЦУЕ Ў ЦЕСНЫМ КАНТАКЦЕ З АМЭРЫКАНСКІМІ І ЯПОНСКІМІ КОЛАМІ. АМЭРЫКАНЦЫ, якія таксама зацікаўлены ў К.-У. чыг. ІМКНУЦЦА, ГАЛОЎНЫМ ЧЫНАМ, ЗАХАПІЦЬ У СВАЕ РУКІ ПАСТАЎКУ МАГУТНЫХ ГРУЗАВІКОЎ ДЛЯ НОВАЙ АНТЫСАВЕЦКАЙ АРМІІ, у той час, як ЯПОНЦЫ ПРАЎЛЯЮЦЬ ВЯЛІКУЮ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЬЦЬ ДА РАСКІНУТЫХ УЗДОЎЖ К.-У. ЧЫГ. ВУГАЛЬНЫХ РАЁНАЎ. На той выпадак, калі ня удасца зьнікчыць савецкі ўплыў на К.-У. чыг. імпэрыялісты нібы мяркуюць з дапамогаю амэрыканскіх грузавікоў АБВЯЗЦЦІ ТАРЫФНУЮ ВАЙНУ К.-У. ЧЫГ. І ПОЎНАСЬЦЮ ПАДАРВАЦЬ ЯЕ ДЗЕЙНАСЬЦЬ.

Артыкул заканчваецца прапановай па адрасе Францыі сваіх паслуг у антысавецкай барацьбе. «Мы — немцы, — піша Абэль, — пакуль што зьяўляемся толькі наглядальнікамі гіганцкай барацьбы [illegible] на Далёкім Усходзе. Але [illegible] пасьпеху ў знач[illegible]сінах з Нямеччынай, [illegible] посьпех далёка-ўсходняга [illegible] ства былі б значна большым. [illegible] на тае настойваньне Францыі на [illegible]скім договары прымушаюць нас задавольніцца толькі роляю наглядальнікаў».

Пазыцыя ПАЗШ у адносінах да СССР прадстаўляе пагрозу ўсеагульнаму міру

ВАШЫНГТОН, 20. «Нацыянальная рада папярэджаньня вайны» (уплывовая буржуазна-пацыфістская арганізацыя ПАЗШ) апублікавала дэкларацыю пад загалоўкам «Наша пазыцыя ў адносінах да Савецкага Саюзу прадстаўляе сабою пагрозу ўсеагульнаму міру». Дэкларацыя пачынаецца з запытаньня: «Ці жадаюць пацыфісты вайны справакаць новую вайну, на гэты раз з Савецкім Саюзам?». Прыпамінаючы аб розных прадлогах, выкарыстаных для кампаніі супроць СССР, а таксама аб прапагандзе камісіі Фіша, дэкларацыя заяўляе:

«За апошні час мы з узрастаючай трывогай сачылі за антысавецкай кампаніяй, якая запаўняе старонкі сусьветнага друку, носіць міжнародны жарактар і яўна мае міжнароднае кіраўніцтва». Дэкларацыя падкрэсьлівае, што цяперашняя пазыцыя Злучаных Штатаў у адносінах да СССР прадстаўляе сабою пагрозу ўсеагульнаму міру і пакавае надзею, што вывучэньне савецкага пытаньня, якое мяркуецца міністэрствам замежных спраў ПАЗШ, «прыведзе да выраўнаньня, што выключыць гэту гнойную рану і дапаможа стабілізаваць міжнародныя адносіны». «Злучаныя Штаты, — гаворыцца далей у дэкларацыі, — павінны ўзяць у свае рукі ініцыятыву вырашэньня канфлікту з Савецкім Саюзам».

Пахаваньне камдэпутата Генінга ператварылася ў грандыёзную баявую дэманстрацыю працоўных мас супроць фашызму

Крывавыя сутычкі паміж дэманстрантамі і паліцыяй

ПАРЫЖ, 22. Учора ў Гамбургу адбылося пахаваньне забітага фашыстамі камуністычнага дэпутата гамбургскага муніцыпалітэту, тав. Генінга. Пахаваньне ператварылася ў надзвычайна магутную баявую дэманстрацыю працоўных мас Гамбургу.

Пасьля пахаваньня паміж дэманстрантамі і паліцыяй адбылися крывавыя сутычкі. Вялікі атрад паліцыі напаў на калёны рабочых, якія вярталіся з могілак, і адкрыў па іх агонь. Стрэлам у галаву забіт адзін рабочы, шмат іншых цяжка паранены.

Абуроныя працоўнага насельніцтва ГГамбургу супроць крывавага тэрору паліцыі непамернае. Сутычкі з паліцыяй былі сьвядома справаваны. Сацыял-дэмакратычны начальнік гамбургскай паліцыі Мэнфэльдэр забараніў жалобныя дэманстрацыі і прадазначэньне праз рабочыя раёны гораду. Аднак, яшчэ задоўга да вызначанага для пахаваньня часу, усе вулицы вакол аднаго, калі ня ўвесь раён быў выбяжны жалобная, працэсіі, былі запоўнены многімі тысячамі рабочых. Калі жалобная працэсія рушылася да могілак, да не далучыліся дзесяткі тысяч людзей. Шматлікія масы запоўнілі, акрамя таго, поўнымі шпалерамі вуліцы. За трупам Генінга ішлі з вянкамі дэлегаты ад ЦК нямецкай кампартыі, шматлікіх партыйных і рэвалюцыйных рабочых арганізацый і 37 арганізацый ад прадпрыемстваў Гамбургу. На труну наложана больш 100 вянкоў. Усяго ў жалобнай працэсіі прымала ўдзел 25 тысяч рабочых, а на могілках у вакоўліцы Ольсдорф сабралася больш 30.000 чал.

Ля адкрытай магілы з прамовай выступіў правадыр нямецкай кампартыі тав. Тэльман, які заявіў:

«Вызваленчая барацьба рабочых патрабавала ў нас новай ахвяры. Адышоў ад нас Эрнст Генінг, адзін з нашых лепшых барацьбітоў. Ён усюды зьяўляўся прадстаўніком партыі, ён жыў жыцьцём нашай партыі. Гісторыя адпомсьціць за яго. Зараз у нашай барацьбе возьмем прыклад з яго. Наперад, за народную рэвалюцыю!»

Пасьля тав. Тэльмана ля магілы выступала шмат іншых прадстаўнікоў рэвалюцыйных і партыйных арганізацый Нямеччыны.

Пасьля пахаваньня, калі рабочыя разыходзіліся з могілак і масы запоўнілі вуліцы, пачаўся паліцэйскі нясноч. Пасьля сэрыі разгонаў дэманстрантаў з дапамогай гумовых дубінак, паліцыя адкрыла па іх беглы агонь.

ГНЕУНЫ ПРАТЭСТ ПРАЦОЎНЫХ БССР

супроць замаху на гандлёвага прадстаўніка СССР у Японіі

На стрэл адкажам умацаваньнем абароны краіны

Заслухаўшы паведамленьне аб замаху на гандлёвага прадстаўніка СССР у Японіі — тав. Анікіева, мітынг рабочых, работніц і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу чырвонасьцяжнага заводу «Бальшавік» выказвае сваё глыбокае абурэньне супроць бандыцкіх спроб японскіх рыбапрамысловцаў сарваць нармальныя дыпляматычныя зносіны паміж пралетарскай дзяржавай і Японіяй. Рабочыя і тэхнэрсанал патрабуюць ад японскага ўраду стварэньня такіх умоў для нашых прадстаўніцтваў, каб ні адзін белагвардзеец, ні адзін буржуазны забойца пи меў магчымасьці адважыцца падняць злачынную руку супроць прадстаўніка пралетарскай дзяржавы.

У адказ на прошукі нашых ворагаў рабочыя абяцаюць партыі і ўраду яшчэ больш умацніць барацьбу за пасьляховае выкананьне і перавыкананьне прамфінплянаў трэцяга рэшаючага году пяцігодкі, аддаючы яшчэ большую ўвагу на ўзмацненьне абароназдольнасьці пралетарскай краіны.

Рабочыя заклікаюць увесь сусьветны пралетарыят, а ў першую чаргу пралетарыят Японіі, яшчэ больш згуртавацца вакол Камінтэрну і пад яго ленінскім шчитам даць апошні бой ладу імпэрыялістычных войн і дыпляматычнай ашуканьцы працоўных мас.

Няхай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б)!

Няхай жыве Камінтэрн — кіраўнік сусьветнага пралетарыяту!

Няхай жыве сусьветны Кастрычнік!

На правакацыйныя выпады адкажам перавыкананьнем прамфінплянаў

Рабочыя друкарні імя Сталіна, заслухаўшы інфармацыю аб замаху на нашага гандлёвага прадстаўніка ў Японіі — тав. Анікіева, — канстатуюць, што замах японскіх капіталістаў на жыцьцё нашага прадстаўніка лішні раз сьведчыць аб падрыхтоўцы сусьветным капіталам інтэрвэнцыі і правакацыі новай вайны супроць СССР.

Рабочыя рашуча пратэстуюць

„ТЭХНІКА У ПЭРЫЯД РЭКАНСТРУКЦЫІ ВЫРАШАЕ ЎСЁ“ (СТАЛІН)

Пакрыць усе цэхі сеткай тэхнічных гурткоў

Усе формы сацспаборніцтва і ўдарніцтва—на аўладаньне тэхнікай

„Аўладаньне тэхнікай—ключ для вырашэньня асноўных задач разьвіцьця нашай сацыялістычнай індустрыі“

(З пастановы VI зьезду саветаў)

Прапановы „Зьвязды“ прыняты

Рабочыя „Бальшавіка“ разгортваюць барацьбу за аўладаньне тэхнікай

12 прапаноў «Зьвязды» рабочым зьезду «БАЛЬШАВІК» аб аўладаньні тэхнікай (гл. «Зьвязду», № 61) былі пакладзены заводзкімі арганізацыямі ў аснову пляну ўкараненьня тэхнічных ведаў у масы. Прапановы «Зьвязды» таксама абмяркоўваліся на нарадзе інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу.

У ПРАГРАМЫ САЎПАРТШКОЛ УКЛЮЧАНЫ ТЭХНІЧНЫЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ. Два разы ў месяц курсанты будуць праходзіць тэхналёгію апрацоўкі скур, хэмію, парасіпавую гаспадарку і асновы прамфінпляну.

Арганізаваны гурток для сярэдняга адміністрацыйнага пэрсаналу. Апрача тэхнічых пытаньняў, гурток будзе займацца вывучэньнем арытмэтыкі.

Арганізаваны партгабінэт, пры якім ёсьць бібліятэка тэхнічнай літаратуры.

Заняткі ў школах і гуртках пачнуцца гэтымі днямі. Між тым, рабочым, не чакаючы пачатку заняткаў, пачалі барацьбу з тэхнічнай няпісьменнасьцю. Брыгада фальцоўшчыкаў узяла шэфства над 4 некваліфікаванымі рабочымі. Брыгада ўзяла па абавязацельства навучыць чорнарабочых працаваць на фальцовачных машынах. Прыкладу фальцоўшчыкаў пасьледвала брыгада замшчыкаў, якая ўзяла шэфства над 10 чорнарабочымі.

Такіх фактаў за апошні час шмат. Зараз заводзкія арганізацыі паставілі задачу перанесьці вывучэньне тэхнікі ў КОЖНУЮ ЎДАРНУЮ БРЫГАДУ.

Бюро рацыяналізацыі дапамагае аўладаньню тэхнікай складаньнем рацыяналізатарскіх тэмнікаў. Яны паказваюць рабочым, якія галіны вытворчасьці і працэсы трэба рацыяналізаваць. Аўтары каштоўных прапаноў прэміююцца. Прозьвішчы іх вывешваюцца ў цэхах. Фота-здымкі і партреты вынаходцаў зьмяшчаюцца ў заводзкай вітрыне.

Аднак, прапанова «Зьвязды» наконт удзелу інжынэрна-тэхнічных работнікаў У ШМАТТЫРАЖЦЫ пакуль што ня выконваецца. Цэхавыя насьценгазэты гэтаму пытаньню не аддаюць выстарчальнай увагі. Тое-ж самае датычыць і шматтыражкі «Рабочае вока». Бюро ІТР ня вылучыла адпаведных спэцыялістаў для асьвятленьня тэхнічных пытаньняў у заводзкім друку. Старшыня бюро ІТР тав. АКСЕЛЬРОД апраўдваецца тым, што яны ўсю ўвагу аддаюць заняткам у школах. «Капі мы возьмемся і за газэты, — кажа ён, — баюся, каб не праваліць заняткаў».

Так ставіць пытаньне, значыць НЕДААЦЭНЬВАЦЬ РОЛІ ЗАВОДЗКАГА ДРУКУ Ў СПРАВЕ АЎЛАДАНЬНЯ ТЭХНІКАЙ.

Да гэтага часу не наладжана работа тэхнічнай кансультацыі. Наладзіць работу кансультацыі было даручана загадчыку партгабінэту, тав. ШЫРАЕВУ, які, аднак, за гэту работу яшчэ ня ўзяўся.

Тэмпы аўладаньня тэхнікай трэба ўзмацніць.

М.

Мабілізаваць ІТР на ўкараненьне тэхнікі ў рабочыя масы

Пастанова прэзыдыуму БелМБІТ'у

Лозунг «дагнаць і перагнаць заходнюю эўрапейскую і амэрыканскую тэхніку» стаіць перад усёй масай савецкіх спэцыялістаў надзвычай адказную задачу—у самы кароткі тэрмін поўнасьцю аўладаць навейшай тэхнікай і прасунуць гэту тэхніку, як мага хутчэй, у шырокія масы рабочых.

У мэтах хутчэйшага ажыцьцяўленьня задач сацыялістычнага будаўніцтва ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, прэзыдыум БелМБІТ'у разам з актывам ІТР г. Менску пастанаўляе:

1. Арганізаваць на кожным прадпрыемстве, саўгасе, больш буйным калгасе і пры МТС вытв.-тэхнічныя гурткі па вузкіх галінах прамысловасьці і сельскай гаспадаркі з мэтай ліквідацыі тэхнічнай няпісьменнасьці і павышэньня вытворча-тэхнічнай кваліфікацыі, а таксама падрыхтоўкі ненасрэдна на вытворчасьці новых тэхнічных кадраў. Арганізаваць на прадпрыемствах тэхнічныя бібліятэкі, забяспечыць [illegible] літаратуры і шырока папулярнай.

[illegible] ВСНГБ пытаньне [illegible] у Менску, Гомелі і Віцебску [illegible] рабочых ВТНУ для падрыхтоўкі адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу, не адрываючы яго ад вытворчасьці.

3. Часьціць перад навукова-даследчым інстытутам пытаньне аб аказаньні практычнай дапамогі ў справе аўладаньня тэхнікай рабочым шляхам прымацаваньня спэцыялістаў да прадпрыемстваў.

4. Арганізаваць праз бюро ІТР рэгулярныя даклады, пікеты і гутаркі на цэхавых сходах рабочых у мэтах поўнага асваеньня вытворчых працэсаў, барацьбы за ўважлівыя адносіны да машын, абсталяваньня, за эканомнае скарыстаньне сырцу, аналу і для тэхнічнай прапаганды шляхоў палепшэньня якасьці прадукцыі.

5. На кожным прадпрыемстве арганізаваць з членаў ІТР кансультацыі для практычнай дапамогі рабочым у справе афармленьня і ажыцьцяўленьня рацыяналізатарскіх прапаноў і вынаходстваў.

6. Арганізаваць на кожным прадпрыемстве вытворча-тэхнічныя выстаўкі дасягненьняў навейшай тэхнікі як упутрысаюзнай, так і замежнай, а таксама экспанатаў добрай і кепскай якасьці прадукцыі гэтага прадпрыемства.

7. Пастаўіць перад гаспадарчымі ўстановамі пытаньне аб забесьпячэньні вытворча-тэхнічных гурткоў адпаведнымі сродкамі.

8. Прапанаваць РВ ІТС пеадкладна арганізаваць НТО на тых прадпрыемствах, дзе яшчэ яны не арганізаваны, а таксама ажывіць работу існуючых НТО.

9. РВ ІТС у дэкады тэрмін распрацаваць канкрэтныя пляны і праграмы вытворча - тэхнічнай вучобы на прадпрыемствах як прамысловасьці, так і сельскай гаспадаркі. Прапанаваць усім РВ ІТС пры ЦП саюзаў і райМБІТ неадкладна прыступіць да абмеркаваньня пытаньня аб уладаньні тэхнікай, распрацаваць на падставе асноўных прапаноў гэтай дырэктывы, канкрэтныя пляны і мерапрыемствы па аўладаньні тэхнікай на прадпрыемствах па адпаведных галінах прамысловасьці і сельскай гаспадаркі.

10. Прапанаваць РВ ІТС і райМБІТ заслухаць даклады пізавых ячэек ІТС аб ходзе гэтай справы.

[illegible] пасяджаньнях прэзыдыуму БелМБІТ рад інфармацый бюро ІТС аб праробленым.

[illegible]

Далей было даручана інжынэру тав. Рабчыку — навучыць мэханікаў працаваць на машынах каляровай пасадкі. Даручэньне ня выканана. І г. д. Уся рэзалюцыя засталася толькі рэзалюцыяй.

Завочнае вывучэньне тэхнічных ведаў не практыкуецца. Інжынэрна-тэхнічны пэрсанал прымацаваны да цэхаў і брыгад, але фармальна, ніякай канкрэтнай работы ён не праводзіць.

ТАВ. ЧЭРАМІСІН — сын гарбара ? работніцы, якая таксама працуе на заводзе. Скончыў прафтэхшколу. Адзін з лепшых маладых рабочых на пашчыльнай машыне. Добра вывучыў усе яе дэталі. Працуе за машынай, якую сам адрамонтаваў і сабраў.

Камунараўцы пачалі паход за тэхніку

На заводзе «Камунар» адбылося аб'яднанае пасяджэньне бюро ІТС, бюро КСМ і шматтыражкі, прысьвечанае пытаньню аб аўладаньні тэхнікай. Выступаўшыя прывялі шмат прыкладаў таго, як тэхнічная няпісьменнасьць аб'ектыўна выступае ў саюзе з нашымі клясавымі ворагамі супроць тэмпаў індустрыялізацыі, супроць выкананьня прамфінпляну. Падкрэслілі, што вялізарны процант браку зьяўляецца раней за ўсё вынікам тэхнічнай няпісьменнасьці.

Вылучаная камісія распрацавала рад практычных мерапрыемстваў, накіраваных на хутчэйшае аўладаньне тэхнікай рабочымі і адміністрацыйна-тэхнічным пэрсаналам заводу.

У такарным і слясарным цэхах арганізуецца гурток па вывучэньні такарных, фрэзэрных і сьвідравальных варштатаў. Кіраваць гурткам будуць майстры і высокакваліфікаваныя рабочыя. Апрача гэтага, арганізуецца гурток па вывучэньні чарчэньня.

У кожным цэху будуць праведзены спэцыяльныя заняткі з рабочымі паводле праграмы, прыстасаванай да вытворчасьці гэтага цэху. Праграма разьлічана на 4 месяцы. Кіраваць заняткамі будуць інжынэрна-тэхнічныя сілы заводу, ВСНГ, электрычнага інстытуту і Белмэталяаб'яднаньня, да якіх завод зьвярнуўся з просьбай дапамагчы інжынэрна-тэхнічнымі сіламі.

Для эканамістаў, плянавікоў, нармоўшчыкаў і іншага інжынэрна-адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу будзе арганізаваны гурток павышанага тыпу, разьлічаны на больш доўгі час са спэцыяльна распрацаванай праграмай заняткаў.

У клюбе заводу арганізуецца «куток тэхнікі», дзе будзе наладжана сталая тэхнічная кансультацыя і дзе кожны рабочы зможа атрымаць даведку па любым тэхнічным пытаньні.

Прынят рад мер па паляншэньні ўмоў вытворчай практыкі студэнтаў на заводзе, у справе палітэхнізацыі, у справе ўзмацненьня і паляншэньня работы плянава-апэрацыйных груп і г. д.

Арганізаваны гурток па вывучэньні электрычнасьці і пастаўлена пытаньне аб эканомным выдаткаваньні электра-энэргіі.

На ўсіх адзначаных мерапрыемствах устаноўлены цьвёрдыя тэрміны і вылучаны асобы, якія нясуць поўную адказнасьць за своечасовую арганізацыю гурткоў. Аб вызначаных мерапрыемствах інфармаваны ўсе рабочыя.

Рабочыя, азнаёміўшыся з прамовай т. Сталіна на зьезьдзе работнікаў прамысловасьці, заяўляюць аб поўнай гатоўнасьці змагацца за аўладаньне тэхнікай. Гэта зьяўляецца заручкай перамогі.

З. Гінзбург.

Тэхніка... бязьдзейнасьці

Рэзалюцыя аб аўладаньні тэхнікай засталася на паперы

26-га лютага адбылася парада адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу разам з рабкорамі віцебскай панчошнай фабрыкі імя Клары Цэткін. Нарада была прысьвечана ўкараненьню тэхнічных ведаў у шырокія рабочыя масы. Быў вызначан рад канкрэтных мерапрыемстваў. Але гэтыя мерапрыемствы да сёньняшняга дня засталіся на паперы.

«Ва ўсіх цэхах прапрацаваць пытаньне аб укараненьні тэхнікі ў масы» — вось першае мерапрыемства, вызначанае нарадай. Пакуль што гэта пытаньне было абмеркавана толькі ў 2-х цэхах.

«Арганізаваць сэмінары інструктароў для ўзьняцьця іх кваліфікацыі» — вось другая пастанова. Нічога ня зроблена.

Трэцяя пастанова — «арганізаваць тэхнічныя гурткі ў цэхах». Таксама нічога ня [illegible]

Пры фабрыцы ёсьць тэхнічная бібліятэка, але яе амаль ніхто не карыстаецца. Тэхнічныя книжкі сярод рабочых не папулярызуюцца.

Такое нядбае становішча тым больш недапушчальна, што на фабрыцы ёсьць інжынэр, чатыры тэхнікі і 150 чал. адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу. Трэба ўжыць усе меры да сапраўднага ўкараненьня тэхнічных ведаў у рабочыя масы.

Арк. Зарубежны.

Недакіраўленасьць папярэдняга тэхнічных ведаў мае ўплыў і на рацыяналізатарскую работу. Рацыяналізатарскі актыў налічвае ўсяго 25 чал. (гэта на 3.500 рабочых!) З рацыяналізатарскім актывам ніякай выхаваўчай работы не праводзіцца. Таму ня дзіўна, што ў рацыяналізатарскі план на 1931 год уключаны толькі 5 мерапрыемстваў, з якіх толькі адно праведзена ў жыцьцё. Гэта адно-адзінае аб «мэсавасьці» рацыяналізатарскага руху. Ніякай масавай растлумачальнай работы вакол пытаньняў рацыяналізацыі не праводзіцца, тэхнічная кансультацыя рабочым і ўдарным брыгадам не атрымліваюць.

Яшчэ горш стаіць справа з вынаходствам. За ўвесь час былі толькі 2 вынаходзіны — рабочага і тэхніка. Вялікая эканомія ад гэтых двух вынаходстваў — у суме 27.000 руб. — адміністрацыі ні ў чым не пераказала.

За 100 проц. выкананьне праграмы вучобы

Азнаёміўшыся з прамовай ТАВ. СТАЛІНА на 1-ай усесаюзнай канфэрэнцыі работнікаў прамысловасьці, агульны сход курсантаў—КУРСАЎ ЧЫРВОНЫХ ДЫРЭКТАРОЎ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ПРЫ ВСНГ БССР, цалкам і поўнасьцю ўхваліў прапанову ТАВ. СТАЛІНА аб выкананьні кантрольных лічбаў трэцяга годкі пяцігодкі ЗА ТРЫ ГАДЫ ПА АСНОЎНЫХ РАШАЮЧЫХ ГАЛІНАХ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

Курсанты лічаць неабходным павесьці рашучую барацьбу з усялякімі шкодніцкімі настроямі і спасьпаньнямі на «аб'ектыўныя» прычыны і труднасьці і ажыцьцявіць у практычнай рабоце сапраўдную рэвалюцыйную бальшавіцкую палітыку і ўзмацніць прамысловасьць пралетарскімі кадрамі.

Мы бярэм на сябе абавязак усю курсавую праграму выканаць за ўдарным парадку як у колькасных, так і ў якасных паказальніках. Адначасова мы, курсанты, разам з выкладчыкамі абвяшчаем сябе ўдарнікамі на 100 проц. выкананьне праграмы і ВЫКЛІКАЕМ НА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА КУРСЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ТЭХНІКАЎ.

Сход курсантаў даручыў прафкому распрацаваць дагавор на падставе існуючых групавых сацдагазароў і вымесьці яго на абмеркаваньне бліжэйшага агульнага сходу.

Па даручэньні агульнага сходу студэнтаў КАРПЭКА.

КЛЮПС ЯН—стары рабочы першага хромавага цэху заводу «Бальшавік». Вельмі ўважлівы і акуратны адносіцца да свайго строгальнага варштату—ніколі не паніне яго брудным, абавязкова пачысьціць, памажа і вытрэ. Свайму зьменнаму таварышу — ВОЙЦЮКУ — ён заўсёды паказвае, як трэба працаваць. У гэтым сэнсе рабочы Клюпс паказвае прыклад іншым рабочым, як трэба дапамагаць аўладаць тэхнікай сваім таварышом.

Рацыяналізатарскае бюро „Дзьвіны“ на грамадзкім буксіры

Пытаньне аб аўладаньні тэхнікай яшчэ „не стаяла“

На віцебскай фабрыцы «Дзьвіна»—2.200 рабочых і каля 45 чал. адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу. Здаецца, што выстарчальная колькасьць ІТР павінна была стварыць адпаведныя ўмовы для пашырэньня тэхнічных ведаў сярод рабочых. Аднак, гэтай справай да апошняга часу ніхто не займаўся.

Пры фабрыцы існуюць 4-хмесячныя тэхнічныя курсы зьменавых майстроў, аднак, з 30 майстроў наведваюць курсы толькі 3. У пачатку арганізацыі гэтых курсаў запісалася 38 рабочых, на сёньняшні дзень засталося толькі 24.

Таварыства «Тэхніка—масам» ня створана. У мінулым годзе існавала школа ўзьняцьця кваліфікацыі рабочых, але школа развалілася і ніхто ня прымае мер для ажыўленьня гэтай работы.

Завочнае тэхнічнае навучаньне на фабрыцы ня мела посьпеху. Тэхнічай бібліятэкай ніхто не карыстаецца. Аб шэфстве кваліфікаваных рабочых над малакваліфікаванымі ня чуваць. Прымацаваньне тэхнічнага пэрсаналу да цэхаў і брыгад носіць выключна фармальны характар, ніякіх практычных вынікаў няма. Шэфства над варштатамі не праводзіцца. Бюро распаўсюджаньня вытворча-тэхнічных ведаў ня створана.

Рацыяналізатарскае бюро існуе таксама толькі фармальна. Да гэтага часу, ня гледзячы на шматлікія пастановы вышэйшых арганізацый, адміністрацыя ня вылучыла спэцыяльнага рацыяналізатара. Рацыяналізатарская актыўнасьць няма. З 34 рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, якія ўключаны ў плян 1931 году, выкананы толькі 3.

Фабрычная шматтыражка пытаньню аўладаньня тэхнікай не аддае належнай увагі.

Гэтымі днямі бюро камсамольскага калектыву ўзяло на сябе ініцыятыву пашырэньня тэхнічных ведаў сярод рабочых. Камсамольскі актыў узяў на буксір рацыяналізатарскае бюро. Распрацаваны плян арганізацыі розных гурткоў па вывучэньні тэхнічных ведаў.

«Трыкутнік» фабрыкі найперш неадкладна падтрымаць ініцыятыву камсамольцаў, бо цяпер рабочых да вывучэньня тэхнікі, да ўзьняцьця сваёй кваліфікацыі вельмі вялікая.

Б.

БАЛАВУЮ СЫСТЭМУ ЎЛІКУ САЦСПАБОРНІЦТВА— *на ўсе чыгуначныя дарогі*

Дакладным улікам вынікаў работы дабіемся яшчэ большага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, поўнага выкананьня трансфінпляну

У чым сутнасьць балавай сыстэмы ўліку

Дакладны ўлік выкананьня вытворчых заданьняў зьяўляецца неабходнай ўмовай разгортваньня спаборніцтва і ўдарніцтва. Між тым да гэтага часу на чыгунцы няма поўнай формы ўліку работы ўдарных брыгад, сацыялістычнага спаборніцтва паміж брыгадзмі і асобнымі ўдарнікамі. У выніку гэтага вельмі часта разваліваюцца ўдарныя брыгады.

Вялікую каштоўнасьць набывае вопыт ударнікаў ст. ЗІМА, якія знайшлі форму ўліку спаборніцтва. Газэта «Труд» у нумары 72 шырока асьвятляе вопыт увядзеньня балавай сыстэмы ўліку работы ўдарнікаў ст. Зіма. Паводле гэтай формы можна ўлічваць выкананьне колькасных і якасных паказальнікаў, рацыяналізатарскую работу, вынаходзтва і г. д. Форма ўліку простая і зразумелая для кожнага рабочага і пабудавана так, што пёгна супаставіць работу асобных брыгад і асобных ударнікаў.

У чым сутнасьць балавай сыстэмы ўліку спаборніцтва, якая ўведзена на ст. ЗІМА?

Кожны рабочы і кожная брыгада, якія ўступаюць у спаборніцтва, атрымліваюць 100 балаў. За добрую работу балы прыбаўляюцца, а за дрэнную вылічваюцца. Кожны член паравознай брыгады і уся брыгада ў цэлым атрымліваюць па адным балу за дзесяць хвілін нагону, за скарачэньне стаянкі на 5 хв. і за здачу паравоза ў чыстым выглядзе ў дэпо. 20 балаў прыбаўляецца за папярэджаньне здарэньня.

Пры дрэнным рабоце адпаведна памяншаецца пік балаў. За спазьненьне на 10 хв., за 5-ці хвіл. затрыманьне цягніка на станцыі па віне брыгады, за несваячасовую падачу паравоза вылічваецца па адным балу.

За спробу здаць паравоз у дэпо ня ў чыстым выглядзе вылічваецца два балы, за збрыў саставу — 10 балаў.

Паравозныя брыгады, па віне якіх здарыпася крушэньне цягніка, або зрыў адпраўленьня з прычыны няяўкі па няўважлівай прычыне ці яўкі ў п'яным выглядзе выключаюцца са спаборніцтва, як інжэўдарныя. Выключаюцца як інжэўдарныя і тыя брыгады, па віне якіх прыходзіцца высылаць дапаможны цягнік, або паравоз.

Балавая сыстэма ўведзена таксама і ў дэпо ст. ЗІМА. Дзяжурны па дэпо атрымлівае па адным балу за кожны паравоз выданы своечасова, а за кожныя 30 хв. пратэрміноўкі падачы бал у яго вылічваецца. Такая-ж сыстэма ўліку ўведзена і на работу брыгад па прамыўцы і абточцы паравозаў.

Апрача таго за кожную рацыяналізатарскую прапанову ў залежнасьці ад яе каштоўнасьці дабаўляецца поўная сума балаў.

Як відаць з вышэйсказанага, форма ўліку работы ўдарнікаў станцыі ЗІМА вельмі простая і зразумелая. Задача партыйных і прафсаюзных арганізацый чыгуначнага транспарту БССР — перанесьці вопыт ударнікаў ст. Зіма на ўсе чыгункі БССР, і зараз-жа ўвесьці балавую сыстэму ўліку.

Балавая сыстэма павінна спрыяць яшчэ больш шырокаму разгортваньню спаборніцтва і ўдарніцтва, падняцьцю творчага ўздыму на больш высокую ступень.

Белбюро ЦК чыгуначнікаў зьвярнулася да ўсіх райпрафсачоў БССР з прапановай шырока прапрацаваць вопыт ўліку спаборніцтва ўдарнікаў ст. Зіма і ўвесьці паказальную сыстэму на сваіх чыгунках.

Шырока прапрацаваць на абмеркаваньні гэтай сыстэмы ўліку ўдарнікаў і вытворчыя нарады, чыгункі БССР павінны як мага хутчэй надзіць пастаянны выкананьня вытворчых заданьняў, сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Неадкладна прапрацаваць вопыт ударнікаў ст. Зіма

Увесьці паказальную сыстэму ўліку на чыгунцы

Райпрафсачам БССР

Вялікае значэньне мае вучот выпікаў кожнага спаборнічачага. На чыгуначным транспарце такога ўліку да гэтага часу амаль што ня было, а калі і быў, дык недакладны і незразумелы рабочым і разрозьнены.

Сыстэму вучоту спаборніцтва і ўдарніцтва выпрацавалі ўдарнікі ст. Зіма, якая надрукавана ў газэце «Труд» ад 14-III—31 г. № 72 пад загалоўкам «Железнодорожники нашли свою форму учета соцсоревнования». Гэта сыстэма сапраўды дае магчымасьць бачыць, як праходзіць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, а таксама дапамагае найлепшаму выкананьню трансфінпляну.

Белбюро ЦК чыгуначнікаў прапануе зараз-жа прапрацаваць гэта пытаньне на прэзыдыуме райпрафсачу сумесна са старшынямі МК і вытворчай нарадай у мэтах увядзеньня паказанай сыстэмы вучоту на чыгунцы БССР.

Аб выніках прапрацоўкі і сыстэмы ўвядзеньня вучоту паведамецо Белбюро ЦК чыгуначнікаў у дэкадны тэрмін.

Старшыня Белбюро ЦК чыгуначнікаў БЕРЗІНГ.

У зьняць ролю Рабкрыну, як арганізатара мас

У разгорнутае наступленьне на бюракратызм

У ажыцьцяўленьні гігантскіх задач разгорнутага сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце, у змаганьні супроць правых—галоўнай небяспекі і «левых» апарацтыстаў—агентуры клясавага ворага ў партыі і дзяржапараце, у мабілізацыі мас на змаганьне з бюракратызмам, шкодніцтвам, на паскарэньне тэмпаў індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, — роля КК-РСІ адырывалі і адыгрываюць вялізную ролю.

Ленінскі Рабкрын, ажыцьцяўляючы сабою партыйны і дзяржаўны кантроль, апіраючыся на ўзрастаючую актыўнасьць рабочых і працоўных мас, прапісуе вялізарнейшую работу на радзе важнейшых вучасткаў сацыялістычнай гаспадаркі і культуры, дапамагаючы партыі і рабочай клясе пасьпяхова выканаць пяцігодку за чатыры гады.

Так, Ленін, гаворачы аб рэарганізацыі Рабкрыну, з усёй выразнасьцю падкрэсьліў, «каб усю працоўную масу, мужчын і жанчын, асабліва, правесьці праз удзел у рабоча-сялянскай інспэкцыі». І, зн. быць «інспэкцыяй рабочых і сялян», узьняць ролю КК-РСІ, як арганізатара рабочых і працоўных мас, ажыцьцяўляючы «пераход неадкладны да таго, каб усе выконвалі функцыі кантролю і нагляду, каб усе на час станаліся «бюракратамі», каб таму ніхто ня мог стаць бюракратам» (Ленін).

Ці створаны зараз усе ўмовы для ажыцьцяўленьня гэтага пістарычнага ўказаньня Уладзімера Ільіча? Так, яны створаны рашаючымі посьпехамі сацыялістычнага будаўніцтва, якія выклікалі бурны рост грамадзка-палітычнай актыўнасьці рабочай клясы і шырокіх працоўных мас на праявленьне ўзрастаючай лініі партыі. Ад органаў КК-РСІ зараз, як ніколі, патрабуецца такое ўзмацненьне і паляншэньне методаў масавай арганізатарскай работы, каб яна адпавядала тэмпам і росту актыўнасьці рабочых і працоўных мас, паставіўшы, як цэнтральную задачу перад органамі КК-РСІ, стаць арганізатарамі сапраўды шырокіх мас па іх мабілізацыі на поўнае выкананьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Зусім правільна ЦК КП(б)Б у сваіх апошніх пастановах падкрэсьлівае, што адзінка дзейнасьці гарадзкой і раённай КК-РСІ будзе даваца па ступені разгортваньня імі масавай работы. «Пераход да разгорнутага наступленьня на бюракратызм, які гармозіць тэмпы нашага развіцьця», патрабуе ад органаў КК-РСІ набліжэньня да таго тыпу арганізацыі «інспэкцыі рабочых і сялян», пад кіраўніцтвам якой павінны працаваць атрады больш праверэных пралетараў, якія карыстаюцца давер'ем усёй масы працоўных і ажыцьцяўляюць кантроль наглядна на ўсіх вучастках сацыялістычнай будоўлі. Указаньне тав. Леніна аб тым, што «ў савецкай дзяржаве чыноўніцтва будзе ўсё больш і больш адмірацьць, зьмяняючыся самадзейнасьцю мас, павінна быць першым чынам прыстасавана да самой РСІ, г. зн. што ў рабоце РСІ галоўнай дзейнай сілай павінна быць маса. Асабліваецца рэканструкцыйнага пэрыяду заключаюцца імсвна ў тым, што за справу праверкі і кантролю ўзяліся самі рабочыя масы. Лепшым доказам гэтага зьяўляецца чыстка савецкага апарату, якая праводзіцца пры найпрыйтным удзеле рабочых мас, і ідэя шэфства—масавага кантролю рабочых зьнізу над савецкім апаратам.

ЦКК-РСІ Беларусі, як органы дасягнулі, як і ўвесь ленінскі Рабкрын, значных посьпехаў на месцах у масавай рабоце. Уся абследаўчая кантрольна-пляновая работа праходзіць пры шырокім удзеле мас. Напрыклад, такія тэмы, як праверка рэгаваньня на заметкі ў друку, толькі на 60 райнах налічваюць 265 брыгад з 800 удзельнікамі. Абследаваньне вылучэньня на БССР праходзіла пры ўдзеле рабочых брыгад у 900 чалавек, праверка будаўніцтва—250 чал., праверка якасьці прадукцыі—600 чал. Вакол ЦКК-РСІ створан кадр сталага добраахвотніцкага актыву да 400 чал., з іх 150 чал. рабочых засядацеляў, выбраных рабочай масай заводаў. Гарадзкія і раённыя КК-РСІ, як пашана-арганізаваныя органы пасьля ліквідацыі авруг, маюць таксама дасягненьні ва ўцягненьні мас. Напрыклад, па 34 райКК створана 419 сэкцый РСІ пры саветах, ахапляючых на раёне ад 120 да 400 чал. рабочых, калгаснікаў, батрацка-бядняцкага і серадняцкага актыву і працоўнай інтэлігэнцыі. Па 30 райКК-РСІ за 3 месяцы прыцягнута да абследваўчай работы 5.780 працоўных. Аднак, ня гледзячы на гэтыя посьпехі, у масавай рабоце КК-РСІ, у гэтым лініі і ЦКК-РСІ ёсьць рад істотных недахопаў. Асноўныя з іх: неадкладнае разгортваньне рабочага шэфства над дзяржапаратам, далёка невыстарчальная работа па пастаноўцы масавай праверкі выкананьня і ўсё яшчэ адносна нізкая праслойка пастаяннага добраахвотніцкага актыву, асабліва рабочых вакол КК-РСІ.

ВЫКАНАЦЬ ВАЖНЕЙШЫЯ ПАСТАНОВЫ ЦКК КП(б)Б

ЦКК КП(б)Б, асабліва ў апошні час, прыняла рад рашучых мерапрыемстваў па ўзьнятьці арганізатарскай ролі КК-РСІ. На працягу сакавіка, сумесна з прафсаюзамі, праводзіцца месячнік праверкі і нападзеньня шэфства заводаў над дзяржапаратам. Асноўныя задачы месячніка—арабіць неадкладны паралом у разгорнутым рабочага шэфства, напружаваць увесь ідэйны спэкс пастаноў партыі па гэтым пытаньні, пастаянна сыстэматычную праверку выкананьня з боку заводаў-шэфаў важнейшых пастаноў партыі і ўраду над шэфным апаратам, дапамагчы апарату пераключыцца на асноўнае методаў сацспаборніцтва і ўдарніцтва на баявыя тэмпы трэцяга рашаючага году пяцігодкі, Прэзыдыум Менскай гарКК КП(б)Б на сваім апошнім пасяджэньні па дакладах заводаў «Бальшавік», «Камунар», «Кастрычнік», Варашылава», «Дрэвапрацоўшчык» і хэмфармзаводу аб становішчы рабочага шэфства над дзяржапаратам прыпаў яго незадавальнятым, кваліфікаваў гэта, як палітычную недахопу з боку гэтых заводзкіх, партыйных і прафсаюзных арганізацый пытаньняў шэфства, што зьяўляецца прадуўленьнем прапага апартунізму на практыцы.

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б на сваім пасяджэньні ад 11-га сакавіка 1931 г. абгаварыў і прыняў пастанову аб стварэньні інстытуту грамадзкіх інспэктароў пры ЦКК-РСІ і ня месцовых органах. На працягу да 15 красавіка стварацца вакол усіх груп ЦКК-РСІ інстытут грамадзкіх інспэктароў у 100 чал., праводзіцца кампанія вярбоўкі добраахвотнікаў у 450-500 чал. Гарадзкія і раённыя КК-РСІ павінны ў сябе таксама стварыць інстытут грамадзкіх інспэктароў ад 5 да 15 чалавек, што складае на Беларусі 600 чалавек пастаяннага актыву, які прымае штодзённы ўдзел у рабоце КК-РСІ. У складзе актыву павінна быць ня менш 75 проц. рабочых ад вытворчасьці, саўгасаў, калгасьнікаў і батрацкоў. Грамадзкія інспэктары павінны вербаваць з праверанага на рабоце актыву КК-РСІ, партыйцаў, камсамольцаў, «лёгкай кавалерыі», перадавых рабочых, якія правялі сябе ў шэфскіх брыгадах, членаў сэкцый РСІ савецкаў, праверацых спэцыялістаў і г. д. Грамадзкія інспэктары павінны прымаць удзел у рабоце РСІ, прыцягвацца да плянавых і на-заплянаваных заданьняў і абследваньняў, да распрацоўкі асобных пытаньняў і праблем. Грамадзкія інспэктары карыстаюцца правамі інспэктара РСІ і нясуць поўную адказнасьць як за выкананьне работы ў тэрміны, так і за якасьць работы. Таму неабходна ва што-б там ні стала дабіцца вызваленьня іх ад усякіх іншых партыйных і грамадзкіх нагрузак, лічачы гэта асноўнай і пастаяннай нагрузкай. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі павінны аказаць дапамогу ККРСІ ў падборы гэтых кадраў, у разгрузцы іх і замацаньні на рабоце КК-РСІ. Ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыемстваў стаіць на вашарэшным рэйсе [illegible] не аб сацыялістычным сумяш[illegible]ні і выкананьні функцый дзяржапарату кожным працоўным пасьля скарачэньня працы на вытворчасьці ў парадку грамадзкай нагрузкі.

Для ўдыму і разгортваньня шэфства, прэзыдыум ЦКК абавязаў усіх інструктароў і інспэктароў устанавіць самую цесную сувязь з шэфскімі брыгадамі, прыцягваючы іх сыстэматычна да сваёй работы, ператварыўшы іх у ініцыятыўных дапаможнікаў ЦКК-РСІ, якія працуюць над палепшэньнем савецкага і кааперацыйнага апарату. У адпаведнасьці з гэтым работнікі КК-РСІ прымацоўваюцца ў дапамогу заводам-шэфам, якія шэфствуюць над тымі ўстановамі, якія, выконваюць кантроль дакад прыны. Ушчуры апарату ЦКК-РСІ вылучаны арганізатары на рабоце з «лёгкай кавалерыяй» сярод спэцыялістаў прамысловасьці і эканомрацыяналізатарскага актыву ўстаноў, з рэвізійнымі камісіямі, рабселькорамі, рабочымі-засядацелямі і актывам «бюро скаргаў». Гэта узьніме на вышэйшую ступень ролю кожнага работніка КК-РСІ, як арганізатара мас, і палепшыць арганізацыйны захоп і выхаваньне актыву рабочых на працы.

Выкананьне гэтых важнейшых мерапрыемстваў павінна праходзіць на асноўе прыцягнаў сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, на вачох шырокіх рабочых мас, ні ў якім разе не дапушчаючы забіўнага «адбору» людзей. Маса павінна даць мандат на права навязць сябе грамадзкім інспэктарам і актывістам РСІ. На найменшыя заявы аб тым, «што няма ў нас актыву, перагрузка і г. д.», трэба рашуча адказаць словамі тав. Леніна, што «ў работу інспэкцыю мы павінны ўцягнуць самых бязьвільных і няразьвітых, самых бязьвільных рабочых і пруньць іх уверх, ніхай яны падніміцца на гэтай рабоце, пагледзіўшы, як рабочая інспэкцыя ўдзельнічае ў дзяржаўных справах, і ніхай яны ад прасьцейшых заняткаў, на якія здольны спачатку ў выглядзе выключаюцца са спаборніцтва, як інжэўдарныя. Выключаюцца як інжэўдарныя і тыя брыгады, па віне якіх [illegible]ва, што палягчае іх уцягненьне ў справу масавага рабочага кантролю над кіраўніцтвам РСІ на розначастайнейшых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

ПРАЗ САЮЗЫ — НА ДАПАМОГУ КК-РСІ

Рост актыўнасьці рабочай клясы, накіраваны на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, магутны ўздым сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў яго вышэйшых формах, выкананьне баявой рашаючай задачы, пастаўленай тав. Сталіным, «аўладаць тэхнікай», вырашэньне пытаньняў якасьці прадукцыі, зьніжэньня сабекошту на аснове сацыялістычнай рацыяналізацыі—патрабуюць самай лепшай узаемнай шпіянскай спрацаванасьці і дапамогі з боку прафсаюзу органам КК-РСІ. На самай справе мы гэтага пішчэ

Кантрактацыя загразла у габінэтах і папках канцылярый

БССР ВЫКАНАЛА ТОЛЬКІ 5,5 проц. ПЛЯНУ КАНТРАКТАЦЫІ ІЛЬНУ

БЮРАКРАТЫЧНЫЯ СПРЭЧКІ ПАМІЖ УСТАНОВАМІ ТАРМОЗЯЦЬ РЭАЛІЗАЦЫЮ ГІСТАРЫЧНАЙ АДОЗВЫ ПАРТЫІ І УРАДУ

Да суровай адказнасьці апартуністаў і бюракратаў, якія дапамагаюць кулаку сарваць ажыцьцяўленьне праграмы разгорнутага сацыялістычнага наступленьня

БССР пляцецца ў хвосьце

БССР ганебна адстае ў справе кантрактацыі тэхнічных культур. Гэта характарызуюць некалькі наступных даных. На 15 сакавіка плян кантрактацыі ільну быў выканан па Іванаўскай вобласьці на 15,48 проц., а па БССР—толькі на 5,47 проц.

Адставаньне БССР тлумачыцца апартуністычнай бязьдзейнасьцю раду цэнтральных і раённых арганізацый, якія да гэтага часу яшчэ не пераключыліся на выкананьне важнейшых дырэктыў партыі і ўраду.

Паміж трох сосен

РЭЧЫЦА.

ЗА 15 САКАВІКА НА РЭЧЫЦКІМ РАЁНЕ НІ ЗАКЛОЧАНА НІ АДНАГО ДАГАВОРУ НА КАНТРАКТАЦЫЮ ЯРАВЫХ. НІ АДНА З МЯСЦОВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ НЯ ВЕДАЕ, ЯК ПРАХОДЗІЦЬ ГЭТА ВАЖНЕЙШАЯ КАМПАНІЯ Ў РАЁНЕ.

РАЙКАЛГАСАЮЗ, ЯКІ ПАВІНЕН БЫЎ ПРЫНЯЦЬ АСАБЛІВА ВЯЛІКІ ЎДЗЕЛ У ПРАВЯДЗЕНЬНІ КАНТРАКТАЦЫІ, АБМЕЖАВАЎСЯ РАССЫЛКАЙ ІНСТРУКЦЫІ ПА СЕЛЬСАВЕТАХ. РАССЫЛКАЙ-ЖА ПЛЯНАЎ ЗАЙМАЎСЯ РВК. У ВЫНІКУ АТРЫМАЛАСЯ ТАКОЕ СТАНОВІШЧА: СЕЛЬСАВЕТЫ, ЯКІЯ АТРЫМАЛІ ПЛЯНЫ, НЯМАЮЦЬ ІНСТРУКЦЫЙ, А ТЫЯ, ЯКІЯ МАЮЦЬ ІНСТРУКЦЫІ, НЕ АТРЫМАЛІ ПЛЯНАЎ.

СПРАВА КАНТРАКТАЦЫІ Ў РЭЧЫЦКІМ РАЁНЕ НАОГУЛ ЗАБЛЫТАЛАСЯ Ў ТРОХ СОСНАХ. АДНА АРГАНІЗАЦЫЯ ЗВАЛЬВАЕ РАБОТУ НА ДРУГУЮ, РАЙКАЛГАСАЮЗ НАПРЫКЛАД, ЛІЧЫЦЬ, ШТО ЁН ТОЛЬКІ ФАРМАЛЬНА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА КІРАЎНІКОМ ГЭТАЙ СПРАВЫ, А ПРАЦАВАЦЬ ПАВІННЫ ЎПАЎНАВАЖАНЫЯ РВК, ЯКІЯ ПРАВОДЗЯЦЬ УСЕ КАМПАНІІ НА ЯЕСЦЫ. ПРАВЯДЗЕНЬНЕ КАНТРАКТАЦЫІ Ў КАЛГАСАХ РАЙКАЛГАСАЮЗ ЗВАЛЬВАЕ НА РАЙКАЛГАССАЮЗ.

РВК-Ж І РАЙКАЛГАССАЮЗ ЗАЯЎЛЯЮЦЬ, ШТО КАНТРАКТАЦЫЯЙ ПАВІНЕН ЗАЙМАЦЦА РАЙКАЛГАСАЮЗ, БО Ў ІХ ЁСЬЦЬ ІНШЫЯ СПРАВЫ.

ТАКІ МАХРОВЫ АПАРТУНІЗМ, КАЛІ ЗАРАЗ-ЖА НЯ ЎЖЫЦЬ РАДЫКАЛЬНЫХ МЕР ДА ЯГО ЛІКВІДАЦЫІ, ГАТРАЖАЕ ЗРЫВАМ КАНТРАКТАЦЫІ Ў РАЁНЕ.

Г. ГАРЭЛІК.

Чарапашыя тэмпы

За 20 дзён закантрактавана толькі 6 проц. ільну

ЧАШНІКІ.

Чашніцкі райкалгасаюз атрымаў патрабаваньні і інструкцыі на кантрактацыі яравых яшчэ ў канцы лютага. Прыблізна тады-ж былі складзены планы ў разрэзе сельсаветаў. Планы, зацьверджаныя РВК, былі накіраваны на месцы.

Здавалася-б, што ніякіх прычын, якія перашкаджалі-б рэалізацыі плану кантрактацыі, няма. Аднак, і на сёньняшні дзень у гэтай галіне зроблена недапушчальна мала. **Кантрактацыя праведзена толькі па калгасным сэктары, ды і то ніводнаму, а па некаторых культурах фактыўна нічога ня зроблена.** Напрыклад, самая важная культура ў гэтым раёне—лён, па калгасах **закантрактавана толькі на 20 проц. План-жа кантрактацыі ільну па раёне наогул выкананы усяго на 6 проц.** Такі тэмп работы—зьяўлеча апартуністычна-бюракратычных адносін да кантрактацыі з боку некаторых раённых арганізацый і раду асобных работнікаў.

Асноўны недахоп выключаецца ў тым, што вакол кантрактацыі не вядзецца масавай работы, што кантрактацыя ня ўвязана з калектывізацыяй. Акрамя таго, у Чашніцкім раёне лічаць, што кантрактацыя гэта справа... выключна райкалгасаюзу. Ніхто гэтай установе ніякай дапамогі не аказвае. У выніку—кантрактацыяй займаюцца толькі 4 работнікі райкалгасаюзу, бо больш у гэтай арганізацыі няма работнікаў. Зразумела, што 4 работнікі ня могуць своечасова і як належыць справіцца з такой вялізарнай задачай, як правядзеньне кантрактацыі па ўсім раёне.

Паданыя факты сьведчаць аб **апартуністычнай недаацэнцы кантрактацыі ў Чашніцкім раёне.** Нічога дзіўнага няма, што гістарычная адозва партыі і ўраду да гэтага часу не прапрацавана ня толькі аднаасобнікамі, але нават і калгасамі.

Нів.

Апартуністы заперліся ў габінэце ад мас

КЛІЧАЎ.

Адозва партыі і ўраду аб кантрактацыі яшчэ ня ставілася на абмеркаваньне калгаснікаў і аднаасобнікаў бедняцкай і сераднякоў. Тут як відаць лічаць за лішняе мабілізаваць масы на выкананьне гэтага важнейшага мерапрыемства. Ня дзіва, што рэалізацыя адозвы праходзіць недапушчальна слаба.

Наступны факт дае яркі малюнак, як праводзіцца кантрактацыя ў нашым раёне. Старшыня райкалгасаюзу Шапетаў сядзіць у сваім габінэце і тут заключае умову з... старшынямі калгасаў. Спачатку ідуць доўгія спрэчкі. Старшыня райкалгасаюзу прапануе старшыні калгасу закантрактаваць пэўную плошчу і пэўныя культуры. **Старшыня калгасу адмаўляецца, заяўляючы, што ў калгасе наогул няма такой плошчы.**

Урэшце дагаворваюцца і умова заключана. Ніхто, зразумела, з радавых калгаснікаў аб гэтым ня ведае.

Такі метад рэалізацыі адозвы партыі і ўраду зьяўляецца найгоршым стылем бюракратычнага выкананьня важнейшых дырэктыў. Больш апартуністычнага падыходу да ажыцьцяўленьня плану кантрактацыі — гэтай праграмы сацыялістычнага наступленьня ў вёсцы, цяжка і прыдумаць. На такой апартуністычнай дзейнасьці трэба рашуча ўдарыць.

Вераскі.

Калі-ж пачнецца работа?

ДРЫВІНА.

Работа на кантрактацыі на Дрывінскім раёне абмежавалася пакуль што тым, што райкалгасаюз распрацаваў планы і разаслаў яго па сельсаветах і калгасах. Сельсаветы-ж да ажыцьцяўленьня плянаў яшчэ не прыступілі.

Раённае спажывецкае т-ва ніякага ўдзелу ў правядзеньні кантрактацыі на прамае і ня хоча прымаць, лічачы, што гэта не яго справа. Райспажывецкае т-ва прытрымліваецца тэй думкі, што яго абавязак—толькі рэалізацыя закантрактаванай прадукцыі.

Райгандаль тав. Харытоненка, атрымаўшы кантрольныя лічбы па кантрактацыі, палажыў іх у папку, а сам паехаў на тыдзень... у госьці. Ніякага ўдзелу ў прапрацоўцы плянаў ня прымаў. РВК таксама ніякіх мер ня ўжыў, каб пасунуць справу з мёртвага пункту.

Трэба самым рашучым чынам рэагаваць на такую правапартуністычную практыку некаторых раённых арганізацый і мясцовых работнікаў.

Д. Д.

Апартуніст і бюракрат Данілаў

РАГАЧОЎ.

Кантрактацыя гатунковых пасеваў збожжавых культур ускладзена на Белкалгаспасеноаю, які праводзіць гэту работу праз сваю сыстэму, а там, дзе яе няма—праз райкалгассаюзы. Белкалгасцэнтр на аснове гэтага запрапанаваў раду райкалгассаюзаў разгарнуць работу па кантрактацыі гатунковых культур. Старшыня Гагачоўскага райкалгассаюзу тав. Данілаў, атрымаўшы такую дырэктыву ад Белкалгасцэнтру, зварачае не Белкалгасцэнтру а наступнай рэзалюцыяй: «Райкалгассаюз ня мае апарату для правядзеньня кантрактацыі».

Рагачоўскі райкалгассаюз знаходзіцца ў лепшых умовах, чым іншыя райкалгассаюзы. Між тым, тавыя адказаў ніхто не даваў. У сьвятле гэтага адказ тав. Данілава зьяўляецца нічым іншым, як апартуністычнай спробай ухіліцца ад удзелу ў правядзеньні важнейшай палітычнай кампаніі.

Скавінскі.

Першая спроба кармленьня сіласом у калгасе «Новае жыцьцё», Койданаўскі раён.

Жыжэлагадоўчая кампэрацыя не распачала работу па кантрактацыі

У раёнах жыжэлагадоўчага напрамку у гэты годзе павінна быць закантрактавана зьёсу на плошчы 219 тыс. гэктараў, ямяню—76 тыс., крупяных культур—31,600, гароху—5.900, сена — 192 тыс., бульбы — 132 тыс., насеньня траў—10.998, садова - гародніча—7.700, тутуну і махоркі—2.300, тэхнічных культур на калажно—78.093 і па насеньне —11861 гэктары.

Жыжэлагадоўчая кампэрацыя БССР, на якую ўскладзена практычнае ажыцьцяўленьне кантрактацыі, да гэтага часу амаль нічога не зрабіла ў справе рэалізацыі адозвы ЦК і СНК. Бязьдзейнічаюць і многія іншыя мясцовыя арганізацыі.

У радзе жыжэлагадоўчых раёнаў партыйныя, савецкія і кампэрацыйныя арганізацыі не папрацавалі адозвы і не прапрацавалі яе прапрацоўкі на групах бедноты і сходах высокага актыву.

Замест практычнай работы па правядзеньні кантрактацыі работнікі некаторых калгасна - кампэрацыйных арганізацый займаюцца разважаньнямі аб рэвізіі плянаў і чакаюць новых дадатковых плянаў і інструкцый. Між тым, пляны і інструкцыі спушчаны ў раёны больш месяца таму назад.

Трэба пакласьці канец апартуністычнай бязьдзейнасьці многіх арганізацый у рэалізацыі важнейшай дырэктывы партыі і ўраду.

Райкалгасаюзы павінны рашуча ставіць пытаньне перад райкомамі КП(б)Б і РВК аб дапамозе ў выкананьні плянаў, кантрактацыі, сыгналізуючы сваячасова аб тых ці іншых прарывах у гэтай рабоце.

Неабходна ўцягнуць у работу па кантрактацыі групы беднаты, высковы актыў, камсамол.

Павінны быць арганізаваны «сквозные» брыгады для праверкі выкананьня дырэктыў партыі і ўраду аб кантрактацыі. Уся работа павінна быць увязана з калектывізацыяй.

Неабходна даць самы рашучы адпор апартуністычным і кулацкім элемэнтам, якія імкнуцца сарваць важнейшае мерапрыемства партыі і ўраду.

ЖУРОМСКІ.

Сярод аднаасобнікаў ніякай работы не вядзецца

ХАЛОПЕНІЧЫ.

У Халопеніцкім раёне павінна быць закантрактавана 3.393 гэкт. толькі аднаго ільну. Закантрактавана-ж пакуль што толькі 400 гэктараў, з якіх у калгасах 160.

Да кантрактацыі іншых яравых культур яшчэ нават не прыступлена.

Па калгасным сэктары кантрактацыя затрымліваецца тым, што па многіх калгасах яшчэ ня складзены вытворчыя планы. Што-ж датычыць індывідуальнага сэктару, дык тут праца належай работы не вядзецца.

Аймор.

У БССР прыбыла брыгада калгасьнікаў—палякаў Мархлеўскага раёну УССР

ПРАПАНОВА РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ «ОРКА» АБ ЗАКЛЮЧЭНЬНІ САЦСПАБОРНІЦТВА ПА ЛЕПШЫМ ВЫКАНАНЬНІ ЗАДАЧ 3-ГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ І АРГАНІЗАЦЫІ НОВАГА СТАЛІНСКАГА КАЛГАСНАГА ПРЫЗЫВУ БЫЛА З ЭНТУЗІЯЗМАМ ПАДХОПЛЕНА ЎСЁЙ МАСАЙ КАЛГАСЬНІКАЎ-ПАЛЯКАЎ.

УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЛЁТ ПОЛЬСКІХ КАЛГАСАЎ, ЯКІ НЯДАЎНА АДБЫЎСЯ Ў МЕНСКУ, ПАСТАНАВІЎ УКЛЮЧЫЦЦА Ў САЦСПАБОРНІЦТВА І ВЫЛУЧЫЎ БРЫГАДУ КАЛГАСЬНІКАЎ ДЛЯ ПАСЫЛКІ Ў ПОЛЬСКІ МАРХЛЕЎСКІ РАЁН (УССР), А ТАКСАМА ЗАПРАСІЎ У БССР БРЫГАДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-ПАЛЯКАЎ МАРХЛЕЎСКАГА РАЁНУ ДЛЯ АЎМЕНУ ВОПЫТАМ У АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ, ДАПАМОГІ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ І АРГАНІЗАЦЫІ НОВАГА СТАЛІНСКАГА ПРЫЛІВУ.

БРЫГАДА КАЛГАСЬНІКАЎ МАРХЛЕЎСКАГА ПОЛЬСКАГА РАЁНУ Ў ЖО ПРЫБЫЛА Ў БССР І НАКІРАВАЛАСЯ ДЛЯ РАБОТЫ Ў ПОЛЬСКІЯ КАЛГАСЫ МАЗЫРСКАГА І НАРАЎЛЯНСКАГА РАЁНАЎ.

БРЫГАДА КАЛГАСЬНІКАЎ-ПАЛЯКАЎ БССР РАЗАМ З ПРАДСТАЎНІКОМ РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ «ОРКА» ВЫЕХАЛА Ў МАРХЛЕЎСКІ РАЁН ДЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў ПРАВЯДЗЕНЬНІ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ, ЯКАЯ ЎЖО ТАМ ПАЧЫНАЕЦЦА.

III Усебеларускі зьезд калгасаў

За 10.700 новых калгасьнікаў—кожную дэкаду

(З дакладу старшыні Белкалгасцэнтру тав. МІЦЬКОВА)

На трыбуне старшыня Белкалгасцэнтру т. Міцькоў. Ў сваім 4-хгадзінным дакладзе ён дае разгорнуты малюнак калгаснага будаўніцтва ў БССР за апошнія два гады, якія, як падкрэсьлівае дакладчык, па сваім значэньні, па тых эрухах, што адбыліся ў нашай краіне, роўны гістарычнай эпосе.

Бядняцка-сераднянкія масы сялянства на прыкладзе буйных саўгасаў і калгасаў упэўніліся ў перавазе калектыўнай гаспадаркі і рашуча павярнулі на шлях калектывізацыі. За справаздачны час у галіне калектывізацыі мы ўжо спачатку перавыканалі лічбы, вызначаныя пяцігадовым планам. Так, паводле пяцігодкі, мы павінны былі зараз мець 4.551 калгас, які-б аб'ядноў 79.933 гаспадаркі на тэрыторыі 756.000 га. На справе-ж мы на сёньняшні дзень ужо маем 5.180 калгасаў, якія аб'ядноўваюць 154.000 бядняцка-сераднянкіх гаспадарак на тэрыторыі ў 2 млн. гэкт.

Калгасы БССР толькі ў выніку простага складаньня сродкаў вытворства паказалі перавагу калектыўнай гаспадаркі над індывідуальнай. У калгасах атрымліваецца значна больш эфэкт у скарыстаньні сродкаў вытворства. Так, вясной 1930 г. у індывідуальнай гаспадарцы на аднаго каня прыпадае апрацоўка 1,9 гэкт., а ў калгасах—3,6 га.

Каб апрацаваць адзін гэктар жыта, аднаасобная гаспадарка траціць 37,8 чалавека-дзён, калгасы-ж—27,8. Ураджайнасьць у калгасах вышэй, чым у індывідуальных гаспадарках. Так, за 1930 г. у індывідуальных гаспадарках з аднаго гектара атрымліваецца 7,9 цэнтн. жыта, у калгасах—8,8 цэнтн.; ячменю ў індывідуальных—6,9 цэнтн., у калгасах—7,5 цэнтн.; бульбы ў індыв.—90 цэнтн., у калгасах — 100. Прыбытак калгаснай сям'і ўжо ў першым годзе працы ў калгасе ў два разы вышэй, чым у аднаасобнай гаспадарцы.

Але было-б зусім няправільным, па-бальшавіцку, гаворыць тав. Міцькоў, —калі-б мы сказалі, што ў нас у калгасах усё добра, што там зусім няма недахопаў.

Па-першае, — падкрэсьлівае дакладчык, — тэмпы калектывізацыі на сёньняшні дзень яўна невыстарчальныя. Мы не скарыстоўваем, як належыць, усе магчымасьці для таго, каб больш шпарка пайсьці па шляху калектывізацыі. Наша праграма — да вясны мець 30 проц. калектывізаваных бядняцка-сераднянкіх гаспадарак. Між тым, на сёньняшні дзень маем 20 проц. калектывізаваных гаспадарак. Сучасныя тэмпы не забясьпечваюць выкананьня нашай праграмы. За апошнюю дэкаду ў калгасы БССР уступіла 5.200 гаспадарак. Каб выканаць праграму, мы павінны зараз кожную дэкаду мець у калгасах 10.700 новых бядняцка-сераднянкіх гаспадарак. Гэта значыць, што кожны калгас за кожную дэкаду павінен уцягнуць ня менш, як па 2 новыя гаспадаркі.

Гэта задача зусім рэальная і магчымая для выкананьня. Трэба толькі больш энэргічна, па-бальшавіцку за яе ўзяцца.

Тав. Міцькоў пералічвае тыя раёны, якія ганебна адстаюць у тэмпах, дзе процант калектывізацыі не перавышае 10. Сюды адносяцца: Гарадоцкі, Гомельскі, Рэчыцкі, Бабруйскі, Ветрынскі і Віцебскі раёны.

Галоўная прычына такога адставаньня ў тэмпах калектывізацыі зьяўляецца тое, што гэтыя райкалгассаюзы нічога не зрабілі для арганізацыі калгаснага прытліву. Многія райкалгассаюзы нават не спраўляюцца з афармленьнем новых калгасаў. Так, у Рагачоўскім раёне новыя калгасы не афармляюцца на працягу 20 дзён. У Чавускім раёне афармленьне зацягваецца больш, чым па месяц.

Трэба арганізаваць работу так, каб афармленьне і складаньне вытворчага пляну новага калгасу не працягвалася больш 10 дзён. Абслугоўваньне новых калгасаў, замацаваньне іх павінна быць карэнным чынам палепшана. Кожны райкалгассаюз павінен штодзенна ведаць, колькі ў яго арганізавалася новых калгасаў, колькі бядняцка-сераднянкіх гаспадарак у іх уцягнута.

Далей тав. Міцькоў адзначае, што частка калгасаў была засмечана варожымі сацыялістычнаму будаўніцтву элемэнтамі. Паводле папярэдніх даных, з калгасаў вычышчана 1.500 кулацкіх гаспадарак. Дакладчык падае факты, калі ў калгас прымаліся раскулачаныя або індывідуальна ападаткаваныя гаспадаркі. Чыстка калгасаў праведзена невыстарчальна. У радзе месц кулакі яшчэ засталіся ў калгасах.

Далей знаючы частку свайго дакладу тав. Міцькоў прыступае арганізацыі калгаснага вытворства.

Асновай калгаснай гаспадаркі зьяўляецца вытворчы плян. Кожны калгас павінен ведаць, што рабіць і калі рабіць. Між тым, па 10 сакавіка 25 проц. калгасаў яшчэ не атрымалі плянаў.

Дрэнная арганізацыя працы — вось асноўны недахоп у рабоце калгасаў. Нормы выпрацоўкі існуюць толькі ў 31 проц. калгасаў. Зьдзельшчына ўведзена ў 9,8 проц. калгасаў. Адсутнасьць норм выпрацоўкі і зьдзельшчыны не дае магчымасьці ўлічваць працу, правільна скарыстоўваць рабочую сілу, скарыстоўваць перавагу калектыўнай гаспадаркі над індывідуальнай. Тав. Міцькоў пры гэтым падае лічбы, якія характарызуюць процант скарыстаньня рабочай сілы на 40 калгасах. Так, на садова-гародных калгасах праца мужчын была скарыстана—на 78 проц., жанчын—на 48 проц.; на сьвінаводных праца мужчын была скарыстана—на 86 проц., жанчын—на 44 проц. Вось да чаго прыводзіць адсутнасьць норм выпрацоўкі і зьдзельшчыны. Варта толькі ўвесьці зьдзельшчыну і нормы выпрацоўкі, як прадукцыйнасьць працы адразу-ж павялічваецца. Між тым, многія райкалгассаюзы ўсё яшчэ спасылаюцца на адсутнасьць работных рук у калгасах.

У большасьці калгасаў мы яшчэ маем нізкую таварнасьць. Галоўныя прычыны — дрэнны догляд жывёлы, нерацыянальнае скарыстоўваньне кармоў. Мы маем рад прыкладаў, калі даглядаць сьвіней або кароў вылучаюць на лепшых калгасьнікаў, а менш вопытных. У радзе калгасаў кармы ідуць пад ногі жывёле. Няма норм выдаткаваньня кармоў. Гэта толькі павялічвае труднасьці з кармамі.

Мы павінны,—кажа дакладчык,—арганізаваць работу так, каб нашы спецыялізаваныя калгасы сапраўды зьяўлялісь фабрыкамі сыру, мяса, масла і малака. Арганізацыя гэтых гаспадарак павінна пайсьці на лініі створаньня спэцыяльных таварных, малочных і сьвінагадоўчых фэрм, арганізацыі кармавой базы, у выпадку такой зьлікае значальне мае сіласаваньне. Наша задача забясьпечыць у гэтым годзе поўнае выкананьне праграмы сіласаваньня.

Далей дакладчык зьвяртае ўвагу на пытаньні насеньнаводзтва і разьвіцьця тэхнічных культур. Шкодніці, якія імкнуліся сарваць наша сацыялістычнае будаўніцтва, сарваць калектывізацыю,—кажа дакладчык,—адным з абектаў сваёй дзейнасьці абралі насеньнаводзтва. Яны ставілі сабе мэтай перашкаджаць забясьпячэньню нашай сельскай гаспадаркі насеньнем, асабліва тых культур, якія павінны ў бліжэйшы час вырашыць рад цяжкіх праблем, у прыватнасьці—насеньне кармавых траў, гародніны і тэхнічных культур.

Для выраўнаньня праблемы насеньнаводзтва ў БССР павінны быць вылучаны 300 калгасаў з плошчай у 100.000 гэкт. Між тым, рад раёнаў зусім адмаўляецца ад выкананьня плянаў насеньнаводзтва. Сюды трэба аднесьці Буда-Кашалёўскі, Мазырскі, Лепельскі, Мсьціслаўскі, Сьмілавіцкі і Чырвона-Слабодзкі раёны.

У гэтым годзе калгасы павінны засеяць 100.000 гэкт. тэхнічнымі культурамі, у тым ліку ня менш 85.000 ільном. Апрацоўка ільну патрабуе шмат рабочай сілы. У нас пачынаюць працаваць 30 ільна-заводаў і перабільных машыны. Пакуль што трэба апрацоўваць ліён тымі сродкамі, якія ў нас ёсьць. Мы ня можам дапусьціць такога становішча, калі на сёньняшні дзень апрацоўка ільну ў калгасах выканана ў размеры толькі 37 проц.

У заключэньне т. Міцькоў, [illegible] чыся на арганізацыі МТС [illegible] на кадраў, падкрэсьліў [illegible] у антысавецкіх чэрвуш — немцы, — пімі калгаснікамі ці іншымі [illegible] гальшчынамі гіганцкай бі[illegible] ня Дзёнкін.

Учора на зьезьдзе

✱ Даклад Белкалгасцэнтру, судаклады ўпаўнаважанага Трактарацэнтру і аб калгасных кадрах ужо заслуханы. Даклады, насычаныя фактамі, лічбамі, малюць гіганцкія посьпехі і перамогі на ўсіх вучастках фронту вялікай сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. І калі ў дакладзе старшыні Белкалгасцэнтру тав. **Міцькова** па пытаньнях аб калгасных кадрах і МТС быў толькі асноўныя наметкі, дык судакладчыкі, кожны на сваёй галіне, удасканалілі палажэньні, высунутыя дакладчыкам.

✱ На зьезьдаўскую трыбуну выходзяць прадстаўнікі калгаснай армії. **Каваленка** — з **Віцебскага** раёну. **Журбікава** — з **Гомельскага, Марголіна** — з **Смалявіцкага.** Сёньня ў спрэчках асаблівы актыўны калгасьніцы. І ня толькі па пытаньні бытавым, але і аб месцы калгасьніцы ў агульным жыцьці калгасным. Гаворыць аб лепшай пастаноўцы калгаснай працы. Дэлегатка з калгасу **«Новае жыцьцё», Смалявіцкага** раёну, **т. Марголіна,** вялікую частку сваёй прамовы прысьвячае пытаньню лепшай арганізацыі працы ў калгасах.

✱ Калі скончыў гаварыць чарговы прамоўца і старшыня зьбіраўся абвясьціць прозьвішча наступнага, яна паднялася з крэсла і крыкнула на ўсю залю:

— Вось я, таварышы, слова хачу... Паколькі я напісьменная, пісаць не магу, але сказаць павінна...

✱ Зала захвалявалася... Даць ёй слова!.. Даць! Даць!

✱ І вось яна ўжо на трыбуне. На высокага росту, у новых гамашах, з хусткай праз руку. Апавіданьне яе з цікавасьцю, ціха слухаюць дэлегаты.

— Я з Турава сама. На зьезд выбралі мяне. Ня ведала ці ехаць, ці ня ехаць. А жанчыны нашы казалі: «Едзь і паслухай, што там наша ўлада і камуністычная партыя кажуць. Запомні і нам перакажы». Я і паехала сюды. Што ўчую, то нашым жанчынам перакажу. А ў калгасе жывем мы, можна сказаць, добра. Як па мойму, дык у нашым калгасе очыпна добра. Ён сабе і невялікі. Але трымаемся мы моцна. У нас усяго многа ёсьціка і многа пастуце, бо — працуем мы шмат.

✱ Яна выходзіць весела з трыбуны і заля ветла сустракае яе воплескамі.

✱ Калгасьніцу з Турава зьмяняе **Яўсеенка** з **Камарынскага** раёну. Ён гаворыць аб тым, што Камарыншчына калектывізавана на 25 проц. Але гэтага мала. Што не хапае кадраў для будаўніцтва, бо на гарадох больш ва ўсё тэхнікі мосьцяцца сядзець, і гаць іх адтуль трэба. Наша будаўніцтва трэба забясьпечыць кадрамі.

✱ Гаворыць калгасьніца з **Боркавіцкага** раёну, т. **Шыманская.** Камуністычная партыя — бальшавікі навялі нас на самым правільным шляху. Але выказваньні калгасьніцкаў-дэлегатаў.

Дзеньнік усебеларускага зьезду калгасаў

— Учора на ранішнім пасяджэньні зьезду, пасьля дакладу тав. Міцькова, выступілі з судакладамі ад Трактарацэнтру тав. Камаву і ад Калгасцэнтру тав. Гутман.

— У спрэчках па дакладах выступіла звыш 20-ці дэлегатаў зьезду. На вячэрнім пасяджэньні ў прэзыдыум зьезду паступіла 9 заяў ад дэлегатаў аб уступленьні ў рады КП(б)Б, аб абвяшчэньні сябе ўдарнікамі другой бальшавіцкай вясны.

— На імя зьезду атрымана рад прывітальных тэлеграм ад розных калгасаў з раёнаў БССР.

— З Ніжняга Ноўгараду атрымана тэлеграма ад краявога калгассаюзу, які вітае зьезд ад імя 250 тысяч калектыўных гаспадарак Ніжагародзкага краю.

За бальшавіцкія тэмпы калгаснага руху*)

Савецкай грамадзкасьці вядома, што беларускія кандрацьцеўцы, контр-рэвалюцыйныя нацыянал-дэмакраты, якія засялі ў дзён час у органах земляробства, змагаліся за капіталістычныя шляхі разьвіцьця сельскай гаспадаркі БССР, насаджаючы хутары і абрубы і пераводзячы моцную кулацкую гаспадарку ў якасьці найбольш прагрэсыўнай формы гаспадараньня. Прыпячатаўшы нарэшце нам дзякую спадчыну. Партыя, няўхільна вядучы шляхам калектывізацыі, перамагае гэтую спадчыну. Ложным дакладам гэтага зьяўляецца рост калектывізацыі па раёнах з высокім процантам хутароў і дробных пасёлкаў.

Бясумоўна, што беларускія кандрацьцеўцы слаёй палітыкай і практыкай знешна пашкодзілі нам. Не падлягае сумненьню, што барацьба за калектывізацыю ў раёнах з высокім процантам хутароў ускладняецца. Там маюцца дадатковыя труднасьці, якіх няма ў іншых раёнах. Факт, што раскіданасьць аднаасобных гаспадарак, гаспадарчых будынкаў і хутароў раёнаў уплывае на тэмпы калектывізацыі. Мы ужо адзначылі, што тэмпы разгорнутага калгаснага руху ў гэтых раёнах адстаюць ад сярэдніх показьнікаў па БССР. Калі на 20 лютага 1931 году сярэдні процант калектывізацыі складаў 17,6, дык на хутарскіх раёнах гэты процант набліжаўся да 14.

Прадукцыйнасьць працы ў калгасах хутарскіх раёнаў таксама ніжэй сярэдніх показьнікаў па БССР. Напрыклад: паданьне па асеньняй сяўбе на хутарскіх раёнах выканана на 16,3 проц. менш, чым на ўсіх калгасах іншых раёнаў, незаблена на 4,8 проц. менш, разьвіваецца камплектаваньне жыжэлагадоўчых калгасаў, вельмі слаба разгорнута масавая і грамадзкая работа ў калгасах і г. д. **Але гэта ні ў якім выпадку не павінна цягнуць адмаўленьня весьці напружаную работу па ўзмацненьні тэмпаў калектывізацыі ў раёнах з вялікім процантам хутароў.** Сустракаюцца камуністы, якія кажуць, што «у нас хутары і таму мы ня можам ісьці ў адносінах калектывізацыі разам з іншымі раёнамі». Гэта няправільны, шкодны погляд. Тут выяўляецца боязнь перад труднасьцямі, якія сустракаюцца на шляхох калектывізацыі хутарскіх раёнаў. Правапартуністычныя элемэнты, тыя проста прапануюць «пачакаць» з калектывізацыяй у хутарскіх раёнах да тэй пары, пакуль там ня будуць створаны ўсе прадпасылкі эканамічнага парадку. Напрыклад, пабудова агульных памяшканьняў, гаспадарчых будынкаў, пакуль на кожны калгас ня прыдасьцца па трактару, які зруйнуе межы хутароў і г. д. А да тэй пары правыя апартуністы прапануюць «пачакаць» з арганізацыяй калгаснага прыліву ў хутарскіх раёнах.

Партыя ніколі ня будзе згодна з падобнымі разважаньнямі. Наадварот, улічваючы асаблівы адказны задачы, якія стаяць перад хутарскімі раёнамі, партыйныя, савецкія, камсамольскія і іншыя арганізацыі павінны сапраўды па-бальшавіцку разгарнуць работу, каб не адставаць ад іншых раёнаў. Дадатковыя труднасьці, якія сустракаюцца ў хутарскіх раёнах, ні ў якім разе не павінны размагнэсьці няўхільную энэргію шырокіх колаў партыйцаў, камсамольцаў і бяднацка-сераднянкага сялянства ў барацьбе за канчатковую ліквідацыю спадчыны беларускіх кандрацьцеўцаў.

Мы таварылі пра тое, што кулацтва імкнецца выкарыстаць самыя рознастайныя спосабы барацьбы супроць калгаснага руху аж да «індывідуальнай» агітацыі і работы сярод жонак аднаасобнікаў уключна. Задача партыі, саветаў і ўсёй калгаснай грамадзкасьці заключаецца зараз у тым, каб бязьлітасна ачышчаць калгасы, засьмечаныя кулацкімі элемэнтамі. Жорсткая клясавая барацьба, якая разгортваецца навакол калгаснага будаўніцтва, патрабуе пралетарскай пільнасьці ў справе прыёму новых членаў калгасу. Гэта ні ў якім разе не азначае, што трэба ўстанаўліваць, якія-б там ня было абмежаваньні ў адносінах прыёму ў калгасы беднякоў і сераднякоў. Наадварот, трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па ўсіх тых, хто будзе імкнуцца ўстанавіць хоць найменшую «проволочку» ў прыёме бяднацкага сялянства ў калгасы. **Справа ідзе аб тым, каб ня пусьціць калгасы ад варожых элемэнтаў, якія пралезьлі ўжо ў калгасы з мэтай разбурыць іх энутры.** У гэтым сэнсе нам патрэбна пралетарская пільнасьць і бакцдольнасьць.

За апошні час у радзе месц заможнік, які атрымаў цьвёрдае заданьне, пайшоў у калгас спэцыяльна для таго, каб уніжаць выкананьня сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай, каб узарыцца ў калгасе, перачакаць «палясу» цьвёрдых заданьняў. На раённай канфэрэнцыі батрацтва і беднаты ў Пятрыкове прыводзіўся рад прыкладаў таго, як заможнікі, увайшоўшыя ў калгас, ня хочуць цалкам абагульваць насеньня, як яны разбазарваюць сваіх коняй пе-рад уступленьнем у калгас і тым самым рад уступленьнем у калгас і тым самым дапамагаюць кулаку, як яны сваю порму лесу возяць на чужых конях. **Ясна, што такога роду дзеяньні накіраваны на дэзарганізацыю калгасу, на падрыў калгаснай вытворчасьці,** і таму зусім правільна робяць нашы калгасы, калі яны ня прымаюць, такіх элемэнтаў. Аднак, было-б няправільным ужываць у адносінах да заможных гаспадарак палітыку, якая ўжываецца намі да кулака (ліквідацыя як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі). Заможны серадняк, які ідзе ў калгас, абагульвае сваю маемасьць і, актыўна дапамагаючы ў працы калгасу, не павінен пазбаўляцца права ўступленьня ў калгасы на агульных падставах. Кожны раз у адносінах да заможнікаў, якія атрымалі цьвёрдыя заданьні, патрэбен індывідуальны падыход, высьвятленьне характару гаспадаркі і таго, наколькі яна эксплёатавала наёмных рабочых. Заможнікаў, якія атрымалі цьвёрдыя заданьні, можна прымаць у калгасы толькі пасьля таго, як яны выканаюць поўнасьцю гэтыя заданьні і пры ўмове неадкладнага абагуленьня аднаведных сродкаў вытворчасьці (рабочая і прадукцыйная жывёла, машыны, іншыя с.-г. прылады і г. д.). Такая практыка калгасаў у адносінах да заможнікаў у сучасны момант. Мы стаім на тым пункце погляду, што гэту практыку трэба працягваць, зьмяняючы не толькі ў залежнасьці ад посьпехаў калгаснага руху, ад замацаваньня існуючых і новаарганізаваных калгасаў, ад разгортваньня справы суцэльнай калектывізацыі.

Нарэшце, трэба проста сказаць, што самі калгасы надзвычай слаба працуюць над разгортваньнем калгаснага прыліву, **ігнаруюць паказ сваіх гаспадарчых дасягненьня

СПЛАУ ПАД ПАГРОЗАЙ

лес да прыстаней ня вывезен. Такелаж не загатоўлен

ПАКОНЧЫЦЬ З АПАРТУНІСТЫЧНЫМІ ТЭМПАМІ ПАДРЫХТОЎКІ ДА СПЛАВУ.—ПРЫМУСІЦЬ ЛЕСБЕЛ ВА УСЕУЗБРАЕНЬНІ СУСТРЭЦЬ КАМПАНІЮ

БАЛЬШАВІЦКІМІ ТЭМПАМІ СКОНЧЫЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ

хуткім часе пачнецца сплаў. Да ага моманту трэба **вывезьці ўвесь заготоўлены лес, падрыхтаваць рабочую сілу, такелаж, прылады, наладзіць эксплятацыю плытагонаў.**

Ужо зараз павінна шырока разгарнуцца падрыхтоўка да сплаву.

Аднак, трэба прызнаць, што **Лесбел падрыхтаваўся да сплаўной кампаніі.**

Няма выразных узаемаадносін паміж леспрамгасамі і сплаўнымі канторамі. Апарат сплаўных контор (Мазырскай, Гомельскай) не ўкамплектаваны работнікамі. Даготуль не завезены на сплаўныя пункты прадукты і прыпасы.

Саюзлеспром ня выканаў пляну забеспячэння сплаву такелажам.

Слаба разгорнута работа па механізацыі і рацыяналізацыі сплаву.

Асабліва дрэнна ідзе падрыхтоўка ў Мазыры.

Падвоз загатоўленага лесу да сплаўных пунктаў зрываецца: на Мазырскім вывезена ня больш 25 проц. заданьня.

Трэба 30 тон якараў—ёсьць 24 тоны, патрэбна 71 тона сплаўных снасьцей—ёсьць 58, замест 9 з паловай тон жалезных тросаў—загатоўлена 1,7 тон. Леспрамгасы нядбайна адносяцца да вязкі тужбы. Трэба навербаваць 12 тысяч рабочых, ёсьць толькі 8 тысяч. **Прыслана 1.260 пар ботаў для плытагонаў, але яны аказаліся нягоднымі, маламеркамі.** Лесбелу далі залуку па 600 плашчоў і 600 куртак, але адказу адтуль няма. Сплаўныя пункты не забясьпечаны жыльлёвымі памяшканьнямі. Сплаўная кантора ня мае ніякіх вестак аб падрыхтоўцы на мясцох. Прафарганізацыі ніякага ўдзелу ў падрыхтоўцы ня прымаюць.

Дрэнна стаіць справа і ў Віцебску, дзе апарат не ўкамплектаваны работнікамі.

Бюро ячэйкі Лесбелу, надаючы асаблівае значэньне своячасовай падрыхтоўцы да сплаву, прызнала ход падрыхтоўкі неадавальняючым.

Бюро ячэйкі пастанавіла мабілізаваць **з 1-га красавіка 30 лепшых работнікаў апарату трэсту для непасрэднай работы на сплаве.**

Адміністрацыі прапанавана ў самы кароткі тэрмін скончыць укамплектаваньне сплаўных контор.

Для правільнай арганізацыі работы на сплаве, і ліквідацыі прарываў, бюро ячэйкі прызнала мэтазгодным арганізоўваць «сквозные» брыгады з беднякоў, сераднякоў і калгасьнікаў.

28 ТЫСЯЧ КБМ ЛЕСУ

МОГУЦЬ УПЛЫЦЬ БЯЗ СЬЛЕДУ

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Лесаматар'ял, які прыбыў у часе леташняга сплаву на Бярэзінскую ветку, далёка ня ўвесь выцягнут з вады на бераг.

Каля 18 тысяч кубамэтраў знаходзяцца пад лёдам 1 сьнегам. Таксама шмат лесу ляжыць на бераго ракі, каля заводаў «Камінтэрн» і «Розы Люксэмбург». З-за нядбайнасьці леспрамгасу 28 тысяч кубамэтраў лесу могуць быць зьнесены веснавой паводкай; леспрамгас даготуль ня ведае, у якім месцы ляжыць лес пад лёдам.

Дырэктар вучлеспрамгасу **Лубнеўскі** месяц назад заявіў, што будзе арганізавана спецыяльная брыгада, якая будзе умацоўваць лес, што ляжыць пад лёдам. Да сёньняшняга дня да работы ня прыступлена, між тым небясьпека не за гарамі.

У сьнежні мінулага году Лесбел прапанаваў леспрамгасу тэрмінова загатовіць 700 тысяч м. тужбы ў сувязі з недахватам дроту. Гэта дырэктыва праляжала ў дырэктара пад сукном звыш 2-х месяцаў; загатоўлена толькі 40 тысяч мэтр. замест 700 тысяч.

На Бярэзінскай ветцы скапілася 2 тысячы кубамэтраў экспартнай драўніны. Чыгунка павінна штодзённа даць пад пагрузку 24 вагоны, дае толькі 12 і зрывае гэтым адпраўку экспартных матар'ялаў. Фураж, які прыбыў для ўдарнай брыгады возчыкаў, што працуе на ветцы, быў, паводле загаду Лубнеўскага, накіраваны Неманіцкаму вучлеспрамгасу. Вось як леспрамгас ліквідуе пробку на Бярэзінскай ветцы.

Паўтараем, калі на будуць прыняты тэрміновыя меры, дык у часе паводкі ўвесь лес упляве, агіне без сьледу.

Барысаўскі.

Чырвоныя абозы з лесам

ЧАЧЭЎІЧЫ. (НАШ КАР.). КАЛГАС «АСЬВЕТНІК» АРГАНІЗАВАЎ ЧЫРВОНЫ АБОЗ З ЛЕСАМ У ГОНАР III-ГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСАЎ. ЗАРОБЛЕНЫЯ ГРОШЫ 87 РУБ., ПАВОДЛЕ ЖАДАНЬНЯ КАЛГАСЬНІКАЎ, АСЫГНУЮЦЦА НА ПАБУДОВУ ТРАКТАРНАЙ КАЛЁНЫ.

***

БУДА-КАШАЛЕЎ. (НАШ. КАР.). БУДА-КАШАЛЕЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ АРГАНІЗАВАЎ СУБОТНІК НА ВЫВАЗЦЫ ЛЕСУ. НА СУБОТНІК ВЫЕХАЛІ 132 ФУРМАНКІ.

БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ ПРАЦАВАЛІ З ВЯЛІКІМ УЗДЫМАМ, АСАБЛІВА ДРУЖНА, ПА-ЎДАРНАМУ ВЫЕХАЛІ НА СУБОТНІК СЯЛЯНЕ В. МАРАЗОВІЧЫ.

ЗГОДНА ПАСТАНОВЫ СХОДУ, НА ЗАРОБЛЕНЫЯ ГРОШЫ БУДУЦЬ НАБЫТЫ АКЦЫІ ТРАКТАРАЦЭНТРУ.

М. КУЧЫНСКІ.

У АДКАЗ НА ХЛУСЬНЮ ІНТЭРВЭНТАЎ

клічаўскія ўдарнікі-лесарубы паказваюць узоры сацыялістычнай працы

КЛІЧАЎ (Наш кар.). 15-га кастрычніка адбыўся зьлёт ударнікаў лесаспраўшчыкаў Клічаўскага раёну. На зьлёт прыбыла больш 120 ударнікаў—калгасьнікаў, бедняко ў і сераднякоў.

Да зьлёту былі арганізаваны чырвоныя абозы з лесам.

На зьлёце прысутнічалі ўдарнікі, якія перавыканалі заданьне па вывазцы і распраўцы лесу.

Асабліва добра працавалі беднякі—Усохоскага сельсавету—**Кукушкін**, Клічаўскага сельсавету—**Тарэлка** і Усачынскага сельсавету,—**Зайцаў**; яны ня мелі ніводнага дня прагулу.

У сваіх выступленьнях ударнікі адзначылі агідную хлусьню інтэрвэнтаў аб прымусовай працы на лесараспраўках. Крыкамі аб «навольніцтве» ў СССР інтэрвэнты імкнуцца падрыхтаваць глебу для інтэрвэнцыі.

Ударнікі спыняліся таксама на клясавай барацьбе вакол загатовак, на агітацыі кулацтва супроць выканаўня пляну.

Ударнік Кукушкін заявіў: «У адказ на кулацкую агітацыю мы працавалі па-ўдарнаму і ў далейшым, пад кіраўніцтвам партыі, будзем выконваць пляны, не палохаючыся труднасьцяй».

Беднякі і сераднякі в. Віркава, Сьвіслацкага сельсавету наладзілі 70 фурманак і вывезьлі каля 250 кбм. лесу.

Вельмі добра працавалі малады калгас Бацэвічы, які атрымаў прэмію за ўдарную работу.

Я. Л.

Віцебскі леспрамгас выклікае на сацспаборніцтва

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Нарада работнікаў леспрамгасу Віцебскага раёну ўзяла на сябе абавязак—цалкам выканаць заданьне па лесазагатоўках і вывазцы да 25-га сакавіка, поўнасьцю падрыхтавацца да сплаву, навербаваць рабсілу, загатовіць такелаж і іншыя прылады.

Работнікі Віцебскага леспрамгасу выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва Гарадоцкі і Бешанковіцкі леспрамгасы. Лёзунг спаборніцтва—БАЛЬШАВІЦКІМІ ТЭМПАМІ СКОНЧЫЦЬ ВЫВАЗКУ ЛЕСУ І Ў ПОЎНАЙ УЗБРОЕНАСЬЦІ СУСТРЭЦЬ ПАЧАТАК СПЛАВУ.

ЛЁЗУНГІ ПА КУЛЬТЭСТАФЭЦЕ

— Барацьба за кадры — барацьба за сацыялізм.

— Выкананьне задач партыі ў галіне культурнага будаўніцтва — задача ня толькі органаў народнай асьветы, але і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

— Усеагульная пісьменнасьць — неабходная ўмова пасьпяховай барацьбы за сацыялізм.

— Выканаем заветы Леніна — створым сапраўды політэхнічную школу.

— Мы павінны ўзяцца за простую пільную справу мабілізацыі пісьменных для барацьбы з непісьменнасьцю (Ленін).

— Камсамолец, твае месца ў першых радох барацьбітоў за культурную рэвалюцыю.

— Праз культэстафэту ўцягнем у справу культбудаўніцтва тысячы прапоўных.

— Пралетары і калгасьнікі, усе ў рады культармейцаў! Усе на барацьбу за ўсеагульнае навучаньне і лікбез!

— Пісьменнасьць — неабходная ўмова поўнага разьвіцьця жанчыны. Работніцы і сялянкі, усе ліквідуйце сваю непісьменнасьць!

— «Час, даўно час павярнуцца тварам да тэхнікі». (Сталін).

— За разгортваньне пралетарскай самакрытыкі [illegible] родная асьветы.

— Асьветнікі, усе ў паход за калгасную вясну!

— Павысім якасьць работы школ і лікпунктаў на аснове палітэхнізацыі.

— Адзіны план культ-будаўніцтва — лепшы сродак барацьбы за бальшавіцкія тэмпы.

— Ператворым клюбы, нардамы і хаты чытальні ў базавыя цэнтры па правядзеньні калгаснай вясны.

— Школы, лікпункты — на выкананьне задач прамфінпляну веснавой пасэўнай кампаніі, калектывізацыі.

— Створым саветы культурнага будаўніцтва — арганізуем пралетарскай грамадзкасьці вакол выкананьня задач культурнай рэвалюцыі.

— Рабочыя, калгасьнікі — усе ў школы, гурткі па зьнішчэньні тэхнічнай непісьменнасьці!

УСЕБЕЛАРУСКІ ШТАБ КУЛЬТЭСТАФЭТЫ.

8 КРАСАВІКА—

першы тыраж пазыкі „Пяцігодка—за чатыры гады"

Да гэтага дня правесьці праверку работы па падпісцы, падрыхтоўцы ўсіх установаў і прадпрыемстваў да тыражу

Баявыя задачы камісій садзейнасьці

8-га красавіка ў Растове-на-Доне адбудзецца першы тыраж пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады».

Выпушчаная, згодна патрабаваньняў рабочай клясы, пазыка «Пяцігодка» была сустрэта з вялікім энтузіязмам. Падпіска на пазыку ператварылася ў дэманстрацыю гатоўнасьці рабочай клясы дапамагчы найхутчэйшай пабудове сацыялізму ў нашай краіне.

Першапачатковыя кантрольныя лічбы былі перавыкананы ў першай-жа паловае кампаніі. Прышлося павялічыць ранейшыя намічаныя рэалізацыі. Гэта было патрэбна, каб ахапіць поўнасьцю ўсіх рабочых і служачых, каб не дапускаць разьвіцьця кампаніі самацёкам.

Ініцыятыва рабочых мас, якая выявілася ў сустрэчных плянах рэалізацыі, у дадатковай падпісцы на пазыку, у якасьці аўказу на шкодніцтва і спробы інтэрвэнтаў, спрыяла ажыцьцяўленьню нават павялічаных кантрольных лічбаў. Той факт, што рад гарадоў і раёнаў ужо перавыканалі павялічаныя заданьні і праводзяць падпіску далей, лішні раз сьведчыць аб тых вялікіх рэзэрвах, якія ў нас ёсьць у справе разьвіцьця ўнутранага дзяржкредыту.

Побач з вельмі добрымі вынікамі рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і служачых (105 проц. па БССР), мы маем прарывы на асобных участках кредытнага фронту.

На вёсцы рэалізавана толькі 48 проц. заданьня. Тэмпы рэалізацыі пазыкі сярод сялянства незадавальняючыя. Той факт, што мы маем рад раёнаў, якія дабіліся вялікіх посьпехаў у рэалізацыі пазыкі сярод сялянства, разьбівае гутаркі клясава-варожых элементаў і апартуністаў аб перашаўлічаных пляны рэалізацыі пазыкі на вёсцы, аб «халодных» адносінах сялянства да пазыкі. Дрэнныя вынікі рэалізацыі па асобных раёнах сьведчаць толькі аб пяўнай меньші разгарнуць масавую работу, увязаць рэалізацыю з іншымі кампаніямі, даць рашучы адпор агітацыі кулака, аб слабым разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва вакол пазык.

Тыраж выйграшаў пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады» павінен будзе яшчэ раз сканцэнтраваць увагу шырокіх працоўных мас на ролі і задачах дзяржкрэдыту ў справе фінансаваньня сацыялістычнага будаўніцтва.

Тыраж, у якім будзе разыграна вялікая колькасьць выйграшаў (каля 250 тысяч), на вельмі вялікую суму—звыш 50 мільёнаў рублёў, закране інтарэсы мільённых мас падпісчыкаў.

Таму галоўная задача фінансавых органаў, апчадкас, кредытных установаў, камісій садзейнасьці дзяржкрэдыту—**як належыць падрыхтавацца да тыражу выйграшаў, рашуча ўзяцца за папуляризацыю тыражу, мабілізаваць вакол гэтай кампаніі шырокія масы савецкай грамадзкасьці.**

Кожны трымальнік аблігацый, нават у самых глухіх куткох рэспублікі, павінен ведаць аб тыражы.

Трэба дабіцца да пачатку тыражу поўнага выкананьня заданьняў па падпісцы.

Асноўны лёзунг падрыхтоўкі—**прыйсьці да тыражу з рапартам аб 100 проц. выкананьні кантрольных лічбаў рэалізацыі.**

Аднак, нельга абмяжоўвацца выкананьнем заданьняў па падпісцы. Трэба дабіцца поўнага паступленьня ўсіх узносаў, разгарнуць шырокую кампанію самаправеркі на кожным прадпрыемстве, установе, саўгасе і калгасе.

Адна з сур'ёзных задач камісій садзейнасьці і фінансава-кредытных органаў—**замацаваньне нумароў аблігацый за трымальнікамі.** Трэба дабіцца, каб замацаваньне аблігацый было скончана да тыражу.

Неабходна таксама зараз-жа правесьці абмен аблігацый ранейшых масавых пазык, бо, калі абмен ня будзе скончан да тыражу, трымальнікі будуць пазбаўлены магчымасьці прымаць ў ім удзел.

УМОВЫ ПРЫЁМУ

у цэнтральную завочную савецка-партыйную школу пры ЗКС КУБ'у імя У. І. Леніна і ў завочны сэктар Усебепарсукай СПШ (Гомель імя Дзяржынскага)

1. Завочная СПШ ставіць задачу даць марксыцка-ленінскую асьвету і арганізацыйна-практычную падрыхтоўку і перападрыхтоўку пізавому партыйна-камсамольскаму і беспартыйнаму актыву раёнаў.

2. Тэрмін навучаньня ў завочнай СПШ разьлічаны на два гады. Ня малочы належнай агульна-асьветнай падрыхтоўкі павінны набыць яе праз папярэднюю завочную вучобу пры завочна-курсавым сэктары, або пры завочным сэктары ўсебеларускай СПШ па праграме дасаўпартшкольнай падрыхтоўкі.

3. Залічаныя ў завочную СПШ павінны быць камандыраваны па ўстановаўную канферэнцыю тэрмінам у адну дэкаду перад пачаткам першага году і па заключную канферэнцыю тэрмінам у 2 дэкады ў канцы навучальнага году.

На заключныя канферэнцыі выклікаюцца толькі актыўныя завочнікі, выканаўшыя паложаную колькасьць заданьняў і лекцый на вучэбным пляне і прыслаўшыя ў ЗСПШ поўную колькасьць пісьмовых прац.

4. Сыстэматычна і здавальняюча працуючыя на поўным навучальным пляне завочнага сэктару ўсебеларускай саўпартшколы маюць права пераходу ў асноўную саўпартшколу пры наяўнасьці згоды з боку райкомаў КП(б)Б і мандатных даных для паступленьня ў асноўную саўпартшколу.

Пераход ажыцьцяўляецца ў канцы навучальнага году без усякіх іспытаў. Пасьпяхова скончыўшыя 1-шы курс завочнага сэктару ўсебеларускай саўпартшколы пераходзяць на 2-гі курс асноўнай саўпартшколы.

5. У завочную СПШ прымаецца партыйны і камсамольскі актыў з ячэек партыі і ЛКСМ вытворчых і сельскіх раёнаў, актыў заўкомаў і пізавога сав. апарату, беспартыйны работны калгасны, батрацкі і бядняцка-серадняцкі актыў (калгасьнікі і дэмабілізаваныя чырвонаармейцы ў першую чаргу). У складзе камандыруемых у ЗСПШ павінна быць беспартыйных ад 25 да 30 проц. Жанчын ня менш 25 проц. агульнага ліку.

Увага: Беспартыйныя рабочыя, калгасьнікі і г. д. павінны мець рэкамендацыю партыйных, прафэсыянальных або савецкіх арганізацый і [illegible] стаж грамадзкай працы ня ніжэй раённага маштабу. Кандыдаты партыі і камсамольцы павінны мець ня менш 3-х год камсамольскага стажу і 2-х год стажу грамадзкай працы.

6. Для паступленьня ў завочную СПШ патрабуецца ўменьне бегла чытаць і выкладаць пісьмова думкі, веданьне 4-х дзеяньняў арытмэтыкі пад цэлымі лічбамі, палітнадрыхтоўка ў абсяг начатковае партшколы і арыентоўка ў асноўных пытаньнях бягучай палітыкі.

7. Устанаўляецца наступная раскладка прымаемых у завочныя саўпартшколы пры Камуністычным Універсытэце імя У. І. Леніна і пры ўсебеларускай СПШ (Гомель):

а) Менскі ГК КП(б)Б	120 м.
б) Віцебскі » »	100 м.
в) Магілеўскі РК » »	75 м.
г) Аршанскі РК » »	50 м.
д) Бабруйскі РК КП(б)Б	50 м.
е) Полацкі РК » »	50 м.
ж) Мазырскі » »	30 м.
з) Гомельскі ГК » »	100 м.
	575 м.

Усім іншым раёнам даецца па 10 мест кожнаму.

8. Ад паступаючых патрабуюцца наступныя дакументы: заява аб прыёме, анкета, жыцьцяпіс і рэкамендацыі ячэйкі КП(б)Б ці ЛКСМ, а для беспартыйных—рэкамендацыя прафарганізацыі, якія дасылаюцца ў ЗКС КУБ'у (Менск, ЗКС, Універсытэцкая, 27) і ЗКС усебеларускай СПШ (Гомель, Парк Луначарскага).

Гаркомы і райкомы КП(б)Б былых: Менскай, Бабруйскай, Віцебскай, Полацкай акруг накіроўваюць матар'ялы на паступаючых у ЗКС Камвузу Беларусі, гаркомы і райкомы КП(б)Б былых: Гомельскай, Магілеўскай, Мазырскай і Аршанскай акруг дасылаюць на паступаючых матар'ялы ў ЗКС усебеларускай саўпартшколы (Гомель).

Залічэньне ў завочныя саўпартшколы правядзіцца мандатнай камісіяй пры Камвузе Беларусі і пры саўпартшколе (Гомель).

Раскладка па камплектаваньні завочных СПШ павінна быць выканана партарганізацыямі да 1-га мая 1931 году.

Загадчык культпропам ЦК КП(б)Б ЧАРНУШЭВІЧ.

Дырэктар інстытуту масавага завочнага навучаньня ЛЕЧКОЎ.

г. Менск.

Падтрымаць ініцыятыву рабочых „Дынамо"

Арганізаваць „дзень праверкі" работы па рэалізацыі

Рабочыя заводу «Дынамо», праз «Рабочую газэту», зьвярнуліся да ўсіх рабочых СССР з прапановай правесьці дзень праверкі работы па рэалізацыі пазык, афармленьні падпіскі, прымацаваньні нумароў аблігацый і г. д. Паводле прапановы рабочых, дзень праверкі павінен ператварыцца ва ўсесаюзны паход за ўзмацненьне рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады».

Ініцыятыва «Дынамо» [illegible] поўнае патрыманьне [illegible] з боку Усерасійскай і Усесаюзнай камісій садзейнасьці дзяржкрэдыту.

Старшыня Усесаюзнай камісіі тав. **Чуцкаеў** прапанаваў усім камісіям садзейнасьці дзяржкрэдыту СССР неадкладна праверыць, ці ўсё імі зроблена для рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады»; праверыць ахоп падпіскай усіх членаў калектываў, як афармлена падпіска, забясьпечыць своячасовае паступленьне ўзносаў, разгарнуць работу па замацаваньні аблігацый пазыкі, каб да тыражу падпісчыкі атрымалі на ручкі замацавальныя талёны, шырока інфармаваць працоўных аб неабходнасьці абмяняць да пачатку тыражу аблігацыі I і II пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі.

Ініцыятыва рабочых «Дынамо» павінна быць падхоплена працоўнымі БССР.

50 калектываў Менску НЕ ЗАМАЦАВАЛІ АБЛІГАЦЫЙ

Замацаваньне аблігацый за падпісчыкамі па г. Менску ў асноўным скончана. На 20-га сакавіка гарадзкая эшчадкаса замацавала аблігацый на 1.420 тысяч рублёў, гарадзкое аддзяленьне Дзяржбанку — на 1.120 тыс. руб.

Засталося замацаваць аблігацый на суму каля 280 тыс. руб. Гэта работа павінна быць праведзена ўдарным парадкам на працягу бліжэйшых дзён.

Аднак, ёсьць звыш 50 калектываў (Белкавпасаюз, Інспэкцыя працы, бэтонны завод, жакты №№ 2, 3, 15, аптэка № 4, сталоўкі МЦРК №№ 2, 35, 39, 42, 50, 59 і г. д.), дзе адміністрацыя дагэтуль не перадала ў крадытныя ўстановы сьпісу падпісчыкаў, у сувязі з чым нельга прасьледзіць замацаваньня аблігацый.

Камісіі садзейнасьці гэтых калектываў павінны прыняць усе меры, каб адміністрацыя паскорыла перадачу сьпісаў, інакш падпісчыкі застануцца без нумароў аблігацый.

Папраўка

У перадавым артыкуле «Зьвязды» № 79 у другой калёнцы, 37-м радку надрукавана: «Нарада па пытаньнях рэчнага транспарту пры ЦК КП(б)Б узьняла арганізаваць да 1-га красавіка, у межах экспэдыцыйных раёнаў рацыкі воды і г. д.».

Замест «да 1-га красавіка» павінна быць «да 1-га сакавіка».

Паведамленьні

— **Усім парткалектывам і фабзаўкомам прадпрыемстваў і навучальных установаў гор. Менску.** ГарКК РСІ прапануе на 25 сакавіка выдучыць ад 3 да 20 добра падрыхтаваных рабокораў і рабочых ударнікаў (выхадных у гэты дзень) для ўдзелу ў масавым рэйдзе-праверцы, якая праводзіць гарКК РСІ супольна з рэдакцыямі газэт «Рабселькор» і «Рабочай», і прыслаць іх у памяшканьне залі пасяджэньняў гаркому КП(б)Б (вул. Энгельса, гарком, 3-ці паверх) 25 сакавіка ў 10 гадз. раніцы. Пра колькасьць таварышчоў, якую патрэбна выдучыць, будзе паведамлена дадаткова. Адказнасьць за выдучэньне ўскладаецца персанальна на сакратароў партколектываў і старшынь фабзаўкомаў.

— **Дом Камсамольцы.** 23 сакавіка, у 19 гадз., пач. № 6, — [illegible] для камсамольцаў і першага [illegible] ЗКС—методыка сацыяльнай працы.

25-га сакавіка, у 19 гадз.—групавая канфэрэнцыя для завочнікаў падрыхтоўкі [illegible] ЗКС і СПШ—беларуская мова.

23-га сакавіка, у 19 гадз., у Доме Камсамольцы адбудзецца пасяджэньне камісіі [illegible] методыбюро ЦК КП(б)Б. [illegible] адбудзецца наступныя т. т.: Модзель, Уладаў, Іаеўскі, Голанд, Гурвіч, Бутцілаў, Янкевіч, Орлік і Макоўскі.

— **ЖАКТ № 15.** 23 сакавіка, у пам. ЖАКТу № 15 адбудзецца сход камуністаў, што жывуць у дамох ЖАКТу № 15. З прычыны важнасьці пытаньня яўка абавязкова.

— **Менгарком КП(б)Б** паведамляе, што дэлегаткі наступных прадпрыемстваў 1 ўстаноў павінны зьявіцца 24 сакавіка у 19 гадз., у пам. прыёмнай ВЦК (пляц Волі) на куставы сход: зав. «Энергія», «Чырвоная зорка», сьпіртазавод, зав. «Ударнік», малочны завод, «Чырв. хімік», шчацін. ф-ка, шпалерн. ф-ка, скарняжн. ф-ка, Дзяржбанк, НКЮ, ЦВК, СНК, друк. СНК, зав. «ДА», трансартрэст, Наркамфінансы, нк. рэдакцый, адтэхкаміцтва, паліклініка, 3-я сав. б-ца, ЖАКТ № 22, папертрэст. Сакратаром партколектываў і ячэек КП(б)Б гэтых прадпрыемстваў і устаноў забясьпечыць своячасовую яўку дэлегатак.

— **БДУ.** 24 сакавіка, у 19 гадз., у 302 аўд.—агульны сход працаўнікоў БДУ. Яўка абавязкова.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.



НА ЗДЫМКУ: Укладка экспартнага лесу

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
23 і 24 сакавіка
Апошнія 2 адкрытыя спэктаклі
„Рэйкі гудуць"
Пачатак а 8 гадз. веч.

Гуляючы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
2 БУЛЬВАРЫ 2
Звыш праграмы: СУДІДЗЕ справа ЦК РСДРП (меншавікоў).
Пачатак: 1 г., 3 г., 45 м., 10 г. 30 м.
КАСА—з 5 гадз.
Замежны фільм «ПОРЫ»
Звыш праграмы: СУДІДЗЕ справа ЦК РСДРП (меншавікоў).
Пачатак: 7 г., 8 г., 45 м., 10 г. 30 м.
КАСА—з 5 гадз.

Кінс-тэатр „Культура"
Замежны фільм
СКРЫПАЧ з ФЛЁРЭНЦЫІ
Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз.
Каса—з 4 г. 30 м.

Кіно „Спартак"
Сучасная бытавая драма
РАЗВОД у 7 частках
Звыш праграмы—хроніка Сакузбіно № 8
Пач. 1 сэансу ў 6 г. Каса—з 4 гадз.

Кіно „Калгасьнік"
Мастацкі фільм
ЗАКОН ГОР драма ў 8 частках
Пачатак сэансаў у 1 гадз. дня.
Каса—з 12 г. дня.

Кіно „Пралетарый"
Сёньня, 23 сакавіка
БАЯВІКІ
ПО ТРАСІЛА
Пачатак ў 7 частках
Пачатак: 1 г., 3 г., 45 м., 10 г. 30 м.
Каса—з 5 гадз.

Беларускі Дзяржаўны Сандроўны Тэатр
пад кір. Галубка.
абвяшчае ПРЫЁМ
артыстаў, артыстак, цымбалістаў і скрыпачоў.
Іспыты будуць у Доме селяніна 27 сакавіка, у 1 г. дня.

Беларускі Дзяржаўны Універсытэт
абвяшчае,
што ПРЫЁМ ЗАЯЎ
від асоб, якія жадаюць паступіць у БДУ на ўсе факультэты,
ПРАЦЯГНУТ да 5 красавіка г. г.
з 5 па 10 красавіка адбудуцца дадатковыя іспыты і залічэньні, а з 10 красавіка па 1-га мая адбудзецца вайсковы абор (мужчыны і жанчыны), на які своячасова павінны зьявіцца ўсе залічаныя.
Рэктар БДУ Каранеўскі.

У ПАМЯШКАНЬНІ ГК МОПР'у
адбудуцца
НАСТУПНЫЯ ПАСЯДЖЭНЬНІ СЭКТАРАЎ:
23-III, у 7 г. веч. пасяджэньне агітмасавага сэктару;
24-III, у 7 г. веч.—пасяджэньне прафсэктару;
25-III, у 7 г. веч.—пасяджэньне жаночага сэктару;
26-III, у 7 г. веч.—пасяджэньне прэзыдыуму ГК.
Усе сэктары павінны патрэбаваць пляны работы да пасяджэньня прэзыдыуму.
З прычыны важнасьці пытаньняў, прыступаць усіх членаў сэктараў абавязкова.
Мен. Гарком МОПР'у.

Менгарком КП(б)Б і Дом Чырвонай армі
абвяшчаюць
ЗЬЛЁТ ЖОНАК НАЧСКЛАДУ
Менскага гарнізону (у памяшканьні Дому Чырвонай арміі).
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Сацыялістычнае будаўніцтва і удзел жонак начскладу.
2. Інфармацыя делегатаў Маскоўскай канферэнцыі.
Пасьля—мастацкая частка.
Сакратары канскіх партыйных прэзыдыумаў прыслаць спісы на зьлёт у Менгарпрэзыдыум КП(б)Б з 21-го сакавіка з 12 да 4 гадз. дня у пакоі № 10.

23-га сакавіка, у 6 гадзін вечара, у памяшканьні ЦСНСБ (Дом Працы, 2-гі паверх, пакой № 1)
адбудзецца
пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму Бел. МБІТ.
Парадак дня:
1) Аб становішчы чыгуначнага транспарту і мерапрыемствах па ўзмацненьні работы бюро ІТС (дакл. упаўнаваж. НКПС—тав. Эгле, бюро ІТС, чыгун. БМІТ).
2) Аб становішчы і перспэктывах ін-ту прамысловасьці (дакл. тав. Слоніма).
3) Аб рэарганізацыі працы ІТС у сувязі з пастановамі V-га пленуму УсеЦСНС.
4) Аб арганізацыі пры Бел. МБІТ арг. бюро НТО (дакл. тав. Бушко).
5) Аб палітасьветнай працы сярод ІТР (дакл. РБІТС і Бел. МБІТ).
6) Аб становішчы працы Бел. МБІТ і арг. пытаньні (дакл. тав. Каменштэйн).
Яўка член. прэзыдыуму, дакладчыкаў членаў рэс. бюро і мясцовых бюро ІТС абавязкова.
ПРЭЗЫДЫУМ Бел. МБІТ.

КАМІСІЯ ЦКК РСІ
прыступіла ДА ЧЫСТКІ апарату
Беларускага Адзяленьня Кнігацэнтру ОГІЗ РСФСР.
Камісія запрашае да усіх работнікаў Беларускага Адзяленьня, а таксама да всіх арганізацый і паведамляе, што кнігарні Кнігацэнтру ОГІЗ у г. Менску прыйдуць на дапамогу менскім на чыстцы і дадуць [illegible] ім дапамогу [illegible] і асобных работнікаў.
Метарчны накіраваць: Менск, Савецкая, 77 кнігарні ЦКОД, камісіі па чыстцы.

УСЕСАЮЗНАЯ АКАДЭМІЯ С.-гасп. навук імя У. І. Леніна
Навукова-даследчы плагасны інстытут («ПНКІ»)
паведамляе, што з прычыны таго, што многіх таварышаў, якія жадаюць паступіць у аспірантуру інстытуту ў летняй прыём 1931 г., у сучасны момант заняты на рабоце на пасеўной кампаніі, прыёмныя іспыты паступаючых перакоўваюцца на МАЙ месяц.
Прыём і разгляд дакументаў кандыдатай камісіяй пратэкуе да 15 мая 1931 г.
Кандыдаты: [illegible] і іншыя дакументы [illegible] «Сох. [illegible] ад 14 студзеня 1930 г. г., якія паступаюць у аспірантуры, прыстаўляюць на адрас «МОСКВА, Б. Дмитровка, 4».
ДЫРЭКЦЫЯ «ПНКІ».

ПРЫ МЕНСКІМ БЕЛПЭДТЭХНІЧНУЮ праводзіцца новы набор слухачоў
на 6-ці-МЕСЯЧНЫЯ пэдагагічныя курсы.
Будзе залічана 100 асоб,
55 процантаў залічаных, будуць атрымліваць стыпэндыю.
Прыём заяў да 3-га красавіка, пачатак заняткаў 5-га красавіка.
Правілы прыёму ў даведніку НКА па 1930-31 г.
Заявы адрасаваць: Менск, Савецкая, 107, Беларускі Пэдагагічны Тэхнікум.
Дырэктар Тэхнікуму ЮНЫН.

Група мастацтва НКА БССР
СКЛІКАЕ
НАРАДУ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ
па пытаньні
напісаньня драматычных твораў
для прафэсыянальнага тэатру, самадзейных гурткоў і лібрэта для оперы.
На нараду запрашаюцца: драмгрупы бел. і яўр. ТРАМ'аў, члены рабочых літаратурных гурткоў, члены драмтаварыстваў, БелАПП, «Узвышша», «Полымя» і персанальна т.т. Александровіч, Аронас, Бірашка, Блісьніцкі, Багінскі, Бядуля, Вольскі, Галубок, Глебка, Ц. Гартны, Гарбуў, Гарбацэвіч, Даўгаполскі, Варэшкі, Ільінскі, Косец, Краніка, Каповіч, Я. Колас, Я. Купала, Кавакоцін, Міцкевіч Раманоўскі, Сташэўскі, Стальмах, Хведаровіч, Чарот, Чорны.
Нарада адбудзецца ў Доме Пісьменьніка 24 сакавіка г. г., у 7 гадз. веч.
Група мастацтва НКА БССР.

23 сакавіка, у 8 гадз. вечара, у Доме Пісьменьніка адбудзецца
ВЕЧАР ДЗІЦЯЧАЙ КНІГІ
На парадку вечара: пытаньні дзіцячай літаратуры, вынікі конкурсу на дзіцячую кнігу і ўскладаньне вянкоў на магілы твораў, выступленьні пісьменьнікаў.
Запрашаюцца культработнікі.
НКА і БДВ.

Патрэбен вольны ст. бухгальтар
Аплата па згодзе.
Адрас у канторы выд-ва «Зьвязды»

Шукаю КВАТЭРУ
або пакой на дваіх. Можна ў любой частцы горада.
Зьвяртацца: рэд-ня «Зьвязды» пакой № 6, для А. К. Тэл. 1-80.